

ВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ **5**

АДЗІНОКІМ ВЫДЗЯЛЯЕЦЦА... КВАТЭРА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 221 (28837)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РЫБАКОЎ, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:**

*«Ажыццёўленае павелічэнне цэн на паліва не кампенсавала змянення кошту сыравіны, нават з улікам пачатку зніжэння кошту нафты ў апошнія тыдні. Рашэнне аб павелічэнні альбо зніжэнні цаны на маторнае паліва прымаецца пасля ўважлівага аналізу сітуацыі па некалькіх паказчыках: кошт нафты, курс беларускага рубля, дынаміка цэн у суседніх краінах, падатковы складнік. У любым выпадку цэны на АЗС Беларусі будуць змяняцца паступова, без рыўкоў».*

# СЯМЕЙНЫ ПОСУД



Ірына АЎЧЫННІКАВА працуе кіраўніком ганчарнага гуртка, які дзейнічае на базе Цэнтра ганчарства вёскі Гарадная Столінскага раёна. Час ад часу яна сама сядае за ганчарны круг і робіць звычайны палескі посуд. Яе дачка Дар'я змалку любіць гліну, а таксама назіраць, як нараджаюцца збанкі і гаршкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- Рэальныя грашовыя даходы беларусаў у студзені — верасні выраслі на 7,8 %.



- **Кіраўнік місіі МВФ у Беларусі Жак Міньян адзначыў рост даверу беларусаў да нацыянальнай валюты.**
- У Віцебскай вобласці аднаўлена электразабеспячэнне больш чым 120 населеных пунктаў, якія пацярпелі ў выніку неспрыяльных умоў надвор'я.
- **Больш за 26 тысяч іншаземцаў атрымліваюць пенсіі ў Беларусі.**
- У Брэсце да тысячагоддзя горада з'явіцца сонечны гадзіннік. Асновай канструкцыі стане герб горада з астранамічнымі аб'ектамі і макетамі славутасцяў.
- **Трое жыхароў Луніна ледзь не сталі ахвярамі няспраўнай пральнай машыны.**

Турызм

## НА ЛЯЧЭННЕ І ПАЛЯВАННЕ

### Што прыцягвае замежнікаў у Беларусі?

**Беларускія санаторыі перасталі быць месцам адпачынку пераважна пажылых людзей. Замежнае медыцынскае абсталяванне, сярод працэдур — не толькі звыклыя лячэбныя і аздараўленчыя, але і спа, і вэлнес-праграмы. Дадайце сюды шведскі стол і беларускую гасціннасць разам з нашымі маляўнічымі краявідамі, гаючымі мінеральнай вадой і гразямі — і сапраўды, чаму б не адпачыць?**

СТАР. 3



Культурны асяродак

## ПА-ПЕРШАЕ, ГЭТА ПРЫГОЖА

### Птушкі, людзі, цытаты з класікаў: хто, як і навошта расфарбоўвае беларускія гарады

**Урбаністычная прастора, якая б экалагічна арыентаваная яна ні была, — тэрыторыя бетону, шкла і металу, шматпавярховых комплексаў, сцен стрыманых колераў. Тым больш яркімі і жыццярадаснымі выглядаюць на гэтым фоне праявы вулічнага мастацтва: муралы на фасадах, крэатыўна афармленыя дзверы, сцены, лесвіцы, трансфарматарныя будкі, пралёты мастоў, упрыгожаныя трафарэтамі агароджы.... Аб'ектам стрыт-арту можа стаць хоць бы звычайная лава, гіганцкі валун або аўтобусны прыпынак — успомнім «прыпынак Адамовіча» ў Глушы, пра які раней пісала наша газета. Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з мастаком Аляксандрам БЛАГІЕМ, вядомым таксама як KONTRA, — адным з тых, дзякуючы каму беларускія гарады (і не толькі) пазбаўляюцца шэрасці.**



СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# СІБІРАК БЕЛАРУСУ СЯБАР

## Беларусь гатова значна павялічыць гандаль з Іркуцкай вобласцю

**Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з губернатарам Іркуцкай вобласці Сяргеем Лёўчанкам перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва.**

Прэзідэнт нагадаў, што амаль два гады прайшло з папярэдняга візіту Сяргея Лёўчанкі ў Беларусь. «Трэба сказаць, што тыя пытанні, пра якія мы дамаўляліся, вырашаюцца, сведчаннем таму з'яўляецца павелічэнне тавараабароту вобласці і Беларусі», — падкрэсліў ён.

Іркуцкая вобласць — прамыслова развіты рэгіён, у якім сканцэнтраваны прадпрыемствы здабыўной галіны. Традыцыйна наша тэхніка, асабліва БЕЛАЗы, выкарыстоўваецца ў вобласці.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы выказаў надзею, што жыхары Іркуцка змаглі ацаніць беларускія аўтобусы, якія з'явіліся на гарадскіх маршрутах. Паводле яго слоў, у гэтым ёсць вялікая патрэба, паколькі не ўсе перамяжоюцца на ўласных аўтамабілях.

Таксама дэлегацыя Іркуцкай вобласці наведае прадпрыемствы «Белкамунмаш», «Штадлер Мінск», азнаёміцца з экалагічнымі электробусамі і камфартабельнымі электрычкамі. «Мы вельмі разлічваем на доўгатэрміновае развіццё нашых кааперацыйных сувязяў паміж беларускімі і іркуцкімі прамысловымі прадпрыемствамі», — сказаў Прэзідэнт.

У якасці прыкладу паспяховай работы ён назваў стварэнне зборачнага завода «Магілёўліфтмаш-Усолле». Цікава, што за дзевяць месяцаў работы здадзена каля 350 ліфтаў.

Ёсць і іншыя кірункі двухбаковага супрацоўніцтва. Беларускі лідар прапанаваў ацаніць магчымасць нарыхтоўкі і перапрацоўкі дзелавой драўніны і рэалізоўваць узаемавыгадныя праекты ў гэтай сферы. Так, беларускае прадпрыемства «Амкадор» гатова аснасціць іркуцкіх лесапрамыслоўцаў сучаснымі лесанарыхтоўчымі комплексамі.

Флагман расійскага машынабудавання — Іркуцкі авіяцыйны завод — у 2019 годзе плануе пачаць серыйную вытворчасць сярэднемагістральных пасажырскіх самалётаў новага пакалення МС-21. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь вельмі ўважліва прыглядаецца да гэтага самалёта, нашы авіятары прапанавалі іх закупляць, аднак, на думку Прэзідэнта, хацелася б, маючы вопыт абслугоўвання тэхнікі савецкага перыяду, перапрафіляваць нашы прадпрыемствы і працаваць у кааперацыі з іркуцкім прадпрыемствам.

Беларусь таксама можа прапанаваць новыя ўзоры трактароў, корма- і збожжаўборачных камбайнаў, якія па сваіх тэхнічных характарыстыках і якасці не саступаюць замежным аналагам, а то і пераўзыходзяць іх, асабліва па кошце. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што бакі ўзаемадзейнічаюць і ў сельскай гаспадарцы, асабліва ў жывёлагадоўлі, раслінаводстве, укараненні перадавых тэхналогій у вытворчасць і перапрацоўку сельгаспрадукцыі.

Яшчэ ў Іркуцкай вобласці працягваецца рэалізацыя жыллёвых праграм, вядзецца работа па стварэнні новых аўтамабільных дарог і рэканструкцыі існуючых.

«Калі мы спатрэбімся ў гэтым плане вам, то, калі ласка, мы з задавальненнем прымем удзел у рэалізацыі тых ці іншых праектаў — ад праектавання да будаўніцтва пад ключ», — сказаў ён.

Прэзідэнт таксама дадаў, што тое ж датычыцца і аб'ектаў фізічнай культуры і спорту, калі будзе неабходнасць.

«У гэтым плане мы гатовы значна павялічыць пакачыкі ва ўзаемным гандлі і будзем рабіць тое, што залежыць ад нас. Паверце, за намі затрымкі не будзе, усе дамоўленасці, якія вы дасягнулі ў ходзе гэтага візіту і яшчэ дасягнеце нейкіх дамоўленасцяў, яны будуць няўхільна выконвацца, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Пераканаваны, што ваш цяперашні візіт пасадзейнічае далейшаму нарошчванню нашага супрацоўніцтва».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што беларусы жывуць на іх землях, роўна як і расіяне — у Беларусі. «Тут вы заўсёды знойдзеце разуменне, падтрымку і дапамогу», — дадаў ён.

У адказ Сяргей Лёўчанка падзякаваў за цёплы прыём і магчымасць сустрэчы. Ён расказаў аб ходзе візіту дэлегацыі, пра пасяджэнне рабочай групы і адзначыў, што ўсе дамоўленасці, якія былі прынятыя два гады таму, выкананы. Губернатар назваў Беларусь вядучым партнёрам у розных сферах супрацоўніцтва.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Блізкая ўлада

## ЧАС ДЛЯ РАЗМОЎ ПРА НАДЗЁННАЕ

**Традыцыйныя прамыя лініі адбудуцца ў суботу, 17 лістапада, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. На званкі будуць адказваць з 9.00 да 12.00:**

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Японія ўпершыню ў гісторыі паслабіць іміграцыйныя абмежаванні



Ніжняя палата парламента Японіі пачала разгляд законапраекта, які дазволіў краіне прыцягнуць больш замежных спецыялістаў за кошт увядзення новага тыпу візы, перадае Nikkei Asian Review. Законапраект прадугледжвае стварэнне двух новых відаў статусу пражывання для замежных работнікаў. Для першага тыпу, які будзе ахопліваць 14 галін прамысловасці, уключаючы догляд за хворымі і састарэлымі, а таксама будаўніцтва і сельскую гаспадарку, заяўнікі павінны будуць адпавядаць пэўнаму набору навыкаў. Другі тып візы будзе давацца работнікам, якія адпавядаюць больш высокім прафесійным патрабаванням. Перагляд іміграцыйнай сістэмы Японіі прыцягне ў краіну ад 260 тысяч да 340 тысяч замежных рабочых на працягу пяці гадоў, пачынаючы з красавіка наступнага года, пішa выданне Japan Today, спасылаючыся на крыніцы ва ўрадзе.

### ЗША выдаткавалі на войны каля 6 трыльёнаў долараў

За апошнія 20 гадоў ЗША патрацілі на вядзенне войнаў каля 5,9 трыльёна долараў. Пра гэта сведчаць даныя даследавання прафесара Браўнаўскага ўніверсітэта Неты Кроўфард. У дакладзе адзначаецца, што ў гэтую суму ўваходзяць не толькі выдаткаваныя Пентагонам грошы, але і «выдаткі, звязаныя з вайной, з боку Дзярждэпа». У іх ліку — сродкі на догляд за ветэранамі вайны, працэнты па доўгу за войны, прадухіленне тэрарыстычных актаў і рэагаванне на іх. У даследаванні таксама прыводзіцца статыстыка, згодна з якой з 2001 года ў войнах з удзелам ЗША загінула больш за 480 тысяч чалавек. Каля паловы з іх — мірныя жыхары.



10 мільёнаў чалавек былі вымушаныя змяніць месца жыхарства. У маі бягучага года паведамлялася, што ЗША пасля тэрактаў 11 верасня 2001 года патрацілі на барацьбу з тэрарызмам прыкладна 2,8 трыльёна долараў. Пры падліках улічваліся выдаткі ўсіх ведамстваў, якія займаюцца процідзеяннем экстрэмізму ў краіне і за мяжой. У іх таксама ўключаны выдаткі на ваенныя аперацыі ў Афганістане, Іраку і Сірыі і міжнародныя праграмы дапамогі.

### Кітайцы вынайшлі калючыя кантактныя лінзы



Новая распрацоўка кітайскіх навукоўцаў — кантактныя лінзы, засеяныя мініяцюрнымі шыпамі. Гучыць як вытанчанае катаванне, аднак гэта вынаходка можа зрабіць сапраўдную рэвалюцыю ў лячэнні хвароб вачэй, перадае BBC. Завостраныя пірамідкі зроблены з матэрыялу, які павольна растварaецца падчас кантакту з вадой, і лекі, якія змяшчаюцца ў «калючках», трапляюць наўпрост унутр вока, абмінаючы знешнюю абалонку. На думку распрацоўшчыкаў, уся працэдура зусім бязбольная — ва ўсялякім выпадку, лабараторныя мышы, на якіх вывучалі новую тэрапію, не праяўлялі ніякіх прыкмет непакою. Аднак выпрабаваць яе на людзях навукоўцы яшчэ толькі маюць намер.

# ЗАЎСЁДЫ РАДЫ ГАСЦЯМ

## Прэзідэнт Егіпта мае намер наведаць Беларусь у першай палове 2019 года

**Аб гэтым стала вядома падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Арабскай Рэспублікі Егіпет Алі Абдэлем Аль Саедам.**

Паводле слоў беларускага Прэзідэнта, Беларусь высока цэніць ролю, якую адыгрывае Егіпет на Усходзе, у стабілізацыі абстаноўкі ў гэтым неспакойным рэгіёне і ва ўрэгуляванні адносін паміж Ізраілем і Палесцінай.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў апошні візіт, які быў здзейснены беларускай дэлегацыяй у Егіпет, бакам удалося пра многае дамовіцца. Сёння ёсць план дзеянняў, як прынята казаць, дарожная карта развіцця адносін. «Я хачу вас, спадар старшыня, запэўніць, што мы поўныя рашучасці прытрымлівацца гэтай дарожнай карты», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў перадаць самыя добрыя словы прэзідэнту Егіпта і адзначыў, што ў Беларусі гатовы прыняць яго ў любы зручны час, каб ён мог бліжэй пазнаёміцца з нашымі магчымасцямі, каб бакі маглі больш прадметна выбудоўваць адносіны.

Прэзідэнт падкрэсліў, што важнае значэнне надаецца супрацоўніцтву нашых парламентаў.

У адказ Алі Абдэль Аль Саед перадаў Прэзідэнту «сардэчнае прывітанне вашага брата, спадара аль-Сісі». Прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах аль-Сісі мае намер наведаць Беларусь у першай палове наступнага года. Акрамя таго, старшыня Палаты прадстаўнікоў Егіпта выказаў падзяку Беларусі за пастаянную падтрымку ўсіх ініцыятыў яго краіны на міжнародных пляцоўках. Ён нагадаў, што і Егіпет таксама пастаянна аказвае падтрымку ўсім беларускім ініцыятывам.

Дарэчы, візіт старшыні Палаты прадстаўнікоў Егіпта ў Беларусь з'яўляецца першым у гісторыі міжпарламенцкіх кантактаў паміж дзвюма дзяржавамі.

***

З Алі Абдэлем Аль Саедам учора таксама сустрэліся старшыні палат беларускага парламента. Разам яны падпісалі пагадненні аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве.

На думку Уладзіміра Андрэйчанкі, старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, падпісанне гэтага дакумента «зробіць наша ўзаемадзеянне больш дынамічным, сістэмным, мы зможам суправаджаць асобныя праекты, якія будуць рэалізоўвацца паміж нашымі краінамі». «Дзякуючы сумесным намаганням і актыўным кантактам нашых бізнес-суполак ужо сёлета ў лютым у Егіпце была створана зборачная вытворчасць аўтамабіляў МАЗ, таксама паступае на егіпецкі рынак наша дарожная і будаўнічая тэхніка», — нагадаў Уладзімір Андрэйчанка. Акрамя таго, існуе супрацоўніцтва з «Бабруйскаграмашам». У Беларусі таксама зарэгістраваны шэраг прадпрыемстваў з егіпецкім капіталам.

Разам з тым, па меркаванні старшыні Палаты прадстаўнікоў, існуе вельмі шмат магчымасцяў для нарошчвання ўзаемадзеяння, бо сённяшняе супрацоўніцтва не адпавядае патэнцыялу абедзвюх дзяржаў. Напрыклад, Егіпет зараз развівае гарнарудную галіну, ідзе здабыча карысных выкапняў, беларускі бок можа тут прапанаваць цікавыя праекты, у тым ліку самазвалы, кар'ерную тэхніку. Таксама Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што наша краіна гатова стварыць зборачную вытворчасць «БелАЗа» на тэрыторыі Егіпта, арганізаваць навучанне спецыялістаў і сэрвіс гэтай тэхнікі. Акрамя таго, ён звярнуў увагу на тое, што Мінскі маторны завод ужо вядзе перагаворы па арганізацыі зборачнай вытворчасці рухавікоў на тэрыторыі Егіпта.

Міхаіл Мясніковіч, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, звярнуў увагу на тое, што беларуска-егіпецкія міжпарламенцкія кантакты становяцца традыцыйнымі. «Міжпарламенцкі дыялог павінен быць больш актыўным, і нядрэнным інструментам для гэтага з'яўляюцца два кірункі: рэгіянальнае супрацоўніцтва і пытанні, звязаныя з работай міжпарламенцкіх груп дружбы. На жаль, нам асабліва ў актыў няма чаго па гэтым пытанні залічыць», — прызнаў Міхаіл Мясніковіч і прапанаваў абмеркаваць актывізацыю дзейнасці груп дружбы і ўзмацненне сувязяў паміж рэгіёнамі.

Акрамя таго, сенатар акрэсліў яшчэ некалькі пытанняў. У Беларусі навучаецца больш за 10 тысяч замежных грамадзян у ВНУ, а з Егіпта — не больш за 20. Гэта вельмі мала. Міхаіл Мясніковіч прапанаваў абмеркаваць, як магчыма палепшыць двухбаковыя навуковыя і адукацыйныя працэсы. Яшчэ адзін аспект — супрацоўніцтва ў ЕАЭС. «Мы бачым добрыя перспектывы развіцця беларуска-егіпецкіх адносін у выпадку, калі будзе дастаткова актыўны рух па падрыхтоўцы пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паміж Егіптам і Еўразійскім эканамічным саюзам, дзе Беларусь адыгрывае ключавую ролю», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі і дадаў, што наш бок падтрымлівае падрыхтоўку гэтага пагаднення.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ, Надзея АНІСОВІЧ.**

# НА ЛЯЧЭННЕ І ПАЛЯВАННЕ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Той факт, што нашы санаторыі імкнуцца трапіць у трэнд еўрапейскай медыцынскай, аздараўленчай і спа-індустрыі, прыцягвае да іх не толькі беларусаў, але і гасцей з блізкага і далёкага замежжа. Колькасць апошніх, як у нашай краіне ў цэлым, так і ў санаторна-курортных і аздараўленчых установах, паступова расце. Паводле слоў **начальніка аддзела арганізацыйна-прававой работы і забеспячэння пуцёўкамі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Іны ПАЛУЯНАВАЙ**, сёлета з пачатку года (за дзевяць месяцаў) у беларускіх здраўніцах адпачыла больш за 190 тысяч замежных гасцей. Летась за такі ж перыяд іх было крыху больш за 154 тысячы. Рэалізацыя паслуг замежным грамадзянам за гэты час павялічылася на 14,4 %, а ў нашых санаторыях яны пакінулі больш за 151 мільён рублёў.

— Аздараўленне ў Беларусі грунтуецца на прымяненні прыродных фактараў. Наша мінеральная вада, напрыклад, не саступае па складзе той, якую ўжываюць на сусветна вядомых курортах. У нас укараняецца новы фармат паслуг — вэлнес і антыэйдж (антыўзроставыя. — **Аўт.**) праграмы, ствараюцца сучасныя спа-цэнтры. Напрыклад, санаторый «Юнацтва» за некалькі апошніх гадоў атэставаны па крытэрыях еўра-спа і медыкал-спа (як медыцынскі спа-гатэль), — расказала Іна Палуянава.

Сярод лідараў у развіцці такіх сучасных кірункаў спецыяліст назвала санаторыі «Юнацтва», «Альфа-Радон», «Спадарожнік», «Прыазёрны». Увогуле ж спа-тэхналогіі ўкаранілі каля паўсотні беларускіх здраўніц. Пры гэтым кошт пражывання даволі ўмераны — 53 рублі ў суткі (за двухмесны аднапакаёвы нумар).

Аднак не столькі паляпшэннем самых санаторыяў, колькі змякчэннем візавага рэжыму тлумачаць эксперты цікавасць да нашай краіны гасцей з замежжа.

— Дзякуючы таму, што бязвізавае знаходжанне ў нашай краіне турыстаў, якія прыбываюць праз аэрапорт Мінск, павялічана да 30 дзён, іх колькасць паступова расце, — заўважыла **консультант аддзела планавання і арганізацыі турыстычнай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Марына МАСТАШОВА.** — З лютага мінулага года па лістапад гэтага з 69 краін свету да нас прыехала амаль 169 тысяч замежных грамадзян.

Акрамя гэтага, у бязвізавым рэжыме замежныя турысты могуць наведваць Аўгустоўскі канал і Белавежскую пушчу. Аўгустоўскі канал (з 26 кастрычніка 2016 года яго можна наведаць без візы) прыехала паглядзець больш за 126 тысяч турыстаў. Гэта грамадзяне Літвы, Польшчы, Латвіі, Германіі і іншых краін. Белавежскую пушчу з моманту ўстанаўлення бязвізу (чэрвень 2015 года) наведала больш за 14 тысяч турыстаў, сюды, як правіла, едуць на паляванне. Усяго ж з пачатку бягучага года ў Беларусь прыехала больш за 3 мільёны 620 тысяч замежнікаў (3 мільёны 328 тысяч за такі ж перыяд летась).

— Павелічэнне працягласці бязвізавага знаходжання садзейнічае таму, што турысты наведваюць не толькі раскручаныя славутасці, але і іншыя нашы прыгожыя мясціны — нацыянальныя паркі, запаведнікі, аграсядзібы, — расказала Марына Масташова.

Поспехі і дасягненні беларускай медыцыны таксама прываблiваюць замежных гасцей. Найбольшым попытам у клініках Беларусі карыстаюцца стаматалагічныя, рэпрадуктыўныя, кардыяхірургічныя, а таксама паслугі па пластычнай хірургіі, акушэрстве, транспланталогіі, дыягностыцы і рэабілітацыі.

**Сёння ў Беларусі працуе 307 санаторна-курортных (105) і аздараўленчых (202) устаноў. Пераважная большасць іх знаходзіцца ў Мінскай вобласці — 155, у Віцебскай вобласці размешчана 109 устаноў, у Брэсцкай — 69 здраўніц.**

— У нас створаны цэнтры, якія займаюцца арганізацыйнымі пытаннямі лячэння замежных грамадзян. Напрыклад, «Мед Трэвэл Беларусь» штогод прывозіць у нашу краіну каля 700 замежнікаў, — адзначае Марына Масташова.

Як падкрэсліў **прадстаўнік інфармацыйнага партала «Клінікі Беларусі» Аляксандр ІЛЬЯШЭВІЧ,** з пачатку года па лячэнне ў Беларусь звярнулася больш за 98 тысяч замежных грамадзян са 121 краіны свету. Найчасцей гэта прадстаўнікі Расіі, Казахстана, Украіны, Азербайджана, Літвы, ЗША і Кітая. Праект «Клінікі Беларусі» створаны на базе Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі для рэкламы медыцынскіх паслуг за мяжой.

Пераважную большасць турыстаў складаюць прадстаўнікі Расіі, Украіны, Казахстана, Азербайджана, Грузіі, Малдовы, Сірыі, Ізраіля, Германіі, Італіі, Емена і іншых краін. Менавіта расіяне пераважаюць і ў ліку замежных гасцей нашых здраўніц (80—87 %), і апошнія гады гэта лічба застаецца больш-менш стабільнай.

**Алена КРАВЕЦ.**

Нябесная канцылярыя

# СПАЧАТКУ СНЕГ, А ПОТЫМ ХОЛАД

## У суботу ўначы добра падмарозіць — месцамі да мінус 10—13 градусаў

**На гэтым тыдні галоўнай сінаптычнай падзеяй ва ўсходніх рэгіёнах краіны стала ўтварэнне снежнага покрыва. На раніцу 15 лістапада вышыня снегу па ўсходняй палове краіны складала ад 1 да 11 сантыметраў, а месцамі дасягала 15—18 сантыметраў. Максімальныя ападкі — у раёне метэастанцыі Лепель, дзе вышыня снежнага покрыва дасягала 21 сантыметра. Дажджы і мокры снег будуць працягвацца і ў выхадныя, паведамілі «Звяздзе» спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сёння і заўтра наша краіна апынецца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску, сфарміраванай у халоднай паветранай масе. Нават днём будзе трымацца невялікі мінус, таму снег, які выпаў, хутка не растане. Пры павышаным фоне атмасфернага ціску ў пятніцу і суботу ападкаў па краіне не чакаецца, толькі ў суботу раніцай і днём у асобных раёнах Віцебскай вобласці пройдуць кароткачасовыя снегапады і дажджы. У асобных раёнах краіны чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца, вецер няўстойлівы слабы.

Пад раніцу ў суботу, па даных сіноптыкаў, будзе мінус 2—9 градусаў, у асобных раёнах, у асноўным па паўднёвым усходзе краіны, ад мінус 10 да мінус 13 градусаў. Днём тэмпература паветра пачне падымацца, да сярэдзіны дня ўжо будзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла. У нядзелю атмасферны ціск пачне падаць і ўмовы надвор'я будуць фарміраваць атмасферныя франты. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца дождж, месцамі з мокрым снегам. Уначы і раніцай месцамі слабы туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, па паўднёвым усходзе падмарозіць да мінус 5—8 градусаў. Удзень усталюецца выключна сырое надвор'е, калі будзе ад мінус 1 градуса да 6 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

З нагоды

# СТАРАЯ ПАШТОЎКА, АРТЭФАКТЫ, НОВЫ ФОТААЛЬБОМ...

**Нацыянальны гістарычны музей краіны адкрыў для мінчан і гасцей сталіцы новыя абсягі ў веданні падзей Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі. Гэтаму паспрыялі і сама выстаўка «1918. Нараджэнне новага свету» і прэзентацыя фотаальбома «Беларусь. 1914—1918. Вайна і мір», у якім сабраны рэпрадукцыі старых паштовак з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава.**




Праект «У пошуках страчанага», што нарадзіўся амаль пятнаццаць гадоў назад на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня», звязаны з многімі медыйнымі ініцыятывамі ў такіх выданнях, як газеты «Звязда», «Голас Радзімы», часопісы «Беларусь» і «Маладосць», сёння набывае ўсё болей выразны грамадскі і асветніцкі характар. Пра гэта на адкрыцці выстаўкі ў Нацыянальным гістарычным вялі размову першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, міністр культуры Юрый Бондар, міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч, старшыня парламенцкай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк, ды і сам калекцыянер — Уладзімір Ліхадзедаў. Адметна, што пазнаёміцца з арыгіналамі старых паштовак чарговы раз завіталі на выстаўку добра вядомыя гісторыкі, пісьменнікі, журналісты, мастакі, калекцыянеры, людзі, якія праяўляюць нераўнадушша да справы захавання гістарычнай памяці нашай Айчыны. У музеі гэтым днём можна было ўбачыць пісьменніцу Алену Харашэвіч, доктара гістарычных навук Анатоля Шаркова, дыпламатаў і збіральнікаў памятак гісторыі, беларускага мастацтва Пятра Краўчанку, Уладзіміра Шчаснага, заслужанага дзеяча культуры Паўла Якубовіча, славутага беларускага краязнаўца і экскурсавода Анатоля Астаповіча, літаратара і краязнаўца Анатоля Бутэвіча, прадстаўніка расійскага пасольства ў Беларусі Андрэя Клінцэвіча, кіраўніка паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа Ігара Маланяка, гісторыка Уладзіміра Багданава...

З просьбай пракаментаваць адкрыццё выстаўкі і прэзентацыю новага філакартычнага альбома, які, дарэчы, пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда», мы звярнуліся да **дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Паўла САПОЦЬКІ.**

— У дні стагоддзя заканчэння Першай сусветнай вайны як аднаго з самых жахлівых ваенных канфліктаў XX стагоддзя вельмі цікава судакрануцца з багатым ілюстрацыйным матэрыялам пра даўнія падзеі, — адзначыў ён. — Сотні паштовак, з якімі нас знаёміць Уладзімір Ліхадзедаў, выразна гавораць пра каштоўнасць міру ва ўсе гістарычныя адрэзкі часу. Разам з калекцыянерам і выявамі з яго збораў мы сягаем у даўніну, адкрываем вобразы нашых прашчураў, спрабуем уявіць іх характары і паводзіны стагадовай даўнасці. Не выпадковым падаецца і тое, што паштоўкам спадарожнічаюць многія цікавыя артэфакты. На выстаўцы адбыліся знаёмствы з канкрэтнымі гістарычнымі персанажамі — нямецкім франтавым фатографам Фрыцам Краускапфам, шараговым расійскім афіцэрам-артылерыстам Гродзенскай крэпасці паручнікам Кананавым, вядомым расійскім мемуарыстам, франтавіком А. Успенскім. Поруч з фотаздымкамі — каталог гістарычнай выстаўкі этнаграфічных, краязнаўчых, мастацкіх матэрыялаў, якую арганізавалі ў Мінску прадстаўнікі акупацыйнай нямецкай адміністрацыі ў 1918 годзе, а яшчэ — пісьмовы прыбор камэнданта Гродзенскай крэпасці генерала М. Кайгародава... Усё гэта дапамагае стварыць атмасферу прысутнасці ў іншым часе, пашырае нашы ўяўленні пра даўнія падзеі. Спадзяюся, што супольныя праекты музея і прыватных калекцыянераў будуць і надалей развівацца на нашай пляцоўцы. А выстаўцы філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава я пажадаў бы падарожжа па ўсёй нашай краіне, ды і за межамі Беларусі таксама.

Між іншым, фотальбом «Беларусь. 1914—1918. Вайна і мір» — 21-е па ліку выданне ў аўтарскай серыі У. Ліхадзедава «У пошуках страчанага». Пэўна, ужо даўно наспела патрэба перавыдання гэтай па свойму ўнікальнай бібліятэкі на розных мовах народаў свету і прадстаўлення праз серыю такіх кніг гісторыі і культуры Беларусі ва ўсім свеце.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Бяспека

# ГІПСАКАРДОН — НА ПРАВЕРКУ

**Камісія па надзвычайных сітуацыях пры Савеце Міністраў Беларусі прыняла рашэнне праверыць усе гіпсакардонныя канструкцыі вялікай плошчы ў гандлёвых цэнтрах краіны. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў прэсслужбе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

Такім чынам, мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы да 19 лістапада складуць спісы аб'ектаў з масавым знаходжаннем людзей, дзе выкарыстоўваюцца канструкцыі з гіпсакардону. Яшчэ месяц спатрэбіцца на іх агляды. Вынікі паступяць у МНС, дзе іх абагульняць.

Нагадаем, што 12 лістапада ў мінскім гандлёва-забаўляльным цэнтры «Арэна-сіці» абвалілася частка падвеснай столі з гіпсакардону, з-за чаго пацярпеў адзін чалавек. Цяпер дзейнасць цэнтра часткова прыпынена, пытанне пра аднаўленне паўнавартаснай работы будзе ставіцца толькі пасля правядзення ўсіх неабходных экспертыз.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Прайграў грошы сужыцелькі

**У аператыўна-дзяжурную службу Першамайскага РУУС г. Мінска паступіла заява аб прапажы грошай у жыхаркі раёна.**

Міліцыянеры ўстанавілі падазраванага ў крадзяжы — 47-гадовага непрацуючага мінчаніна, які раней быў судзімы за няплату аліментаў. Мужчына перыядычна пражываў у кватэры пацярпелай. Напярэдадні свайго ад'езду яна пакінула фігуранту ключы ад жылля і папрасіла дагледзаць кветкі. Мужчына спраўна палівай расліны, пакуль не знайшоў у кватэры грошы. І вырашыў выпрабаваць фартуну — паехаў гуляць у казіно. Частку грошай ён прайграў адразу, а па астатнія вярнуўся пасля нядаўна. Адыграцца не атрымалася, усяго на азартныя гульні мужчына патраціў чатыры тысячы долараў і дзве тысячы еўра. Заведзена крымінальная справа, фігуранту пагражае ад двух да сямі гадоў з канфіскацыяй.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Клічаў.

# ПА-ПЕРШАЕ, ГЭТА ПРЫГОЖА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мне здаецца, якраз медыя і раздзялілі паняцці графіці і стрыт-арт, — гаворыць удзельнік мастацкай суполкі «ТАКТАК» Аляксандр Kontra, з якім мы сустракаемся літаральна на рабочым месцы — у амаль завершаных інтэр'ерах сталічнай кавярні. — Насамрэч гэта часткі цэлага, і розніца хіба ў тым, што графіці — перадусім шрыфты, жаданне пазначыць сваю тэрыторыю, а стрыт-арт бліжэй да жывапісу, ім займаюцца не толькі пачаткоўцы, але і высокапрафесійныя мастакі, а калі гаворка пра муралы, то малюнкі абавязкова з падтэкстам, з пэўным пасылам, які мастак нясе гледачам».

У беларускіх рэаліях ёсць і яшчэ адно адрозненне: графіці, як правіла, выконваюцца несанкцыянавана і гарадскімі ўладамі разглядаюцца як дробнае хуліганства, у той час як муралы найчасцей малююць на законных падставах, з дазволу і адабрэння раённай адміністрацыі. Зразумела: мала каму хочацца, каб малюнак, над якім даводзіцца працаваць не адзін дзень, адразу зафарбавалі «ЖЭС-артам», таму ўзгадненне — хоць і не самы хуткі, але затое надзейны шлях захаваць вулічную карціну на доўгі час.

**— З чаго пачынаўся стрыт-арт для вас, калі ўлічыць, што за плячыма — архітэктурны факультэт БНТУ?**

— Шчыра прызнаюся, мастацкай адукацыі ў мяне няма, — усміхаецца суразмоўнік. — Сваю першую работу я намаляваў у 2000-м, калі яшчэ жыў у вёсцы ў Брэсцкім раёне. Мы з хлопцамі захапіліся брэйк-дансам і хіп-хоп-культурай. Хтосьці потым пачаў танцаваць, хтосьці, начытаўшыся артыкулаў у «Музычнай газеце», сам спрабаваў пісаць хіп-хоп-тэксты, а нас з сябрамі зацікавілі малюнкі. Ну і аднойчы рашыліся самі намаляваць штосьці падобнае.

**— У вёсцы да гэтага паставіліся прасцей, чым у горадзе, альбо таксама абазвалі хуліганамі і загадалі зафарбаваць вашы штукарствы?**

— Нашмат прасцей. Наша тусоўка складалася са звычайных, нічым не адметных хлопцаў — толькі што добра вучыліся, былі такімі, ведаеце, «ботанамі». А тут зрабілі малюнак на сцяне стадыёна — яна была жудасна пабеленая, страшная, словам, сапсаваць яе было немагчыма — і наступным ранкам уся школа, уключаючы настаўнікаў і дырэктара, сабралася паглядзець. Адразу скажу: нічога нам за гэта не было, палічылі хлапечым свавольствам, але аднагодкі запаважалі.

**— Першую сур'ёзную работу прыгадаеце?**

— Партрэт Уладзіміра Караткевіча, намаляваны ў 2014-м у межах мастацкай акцыі Must Act — Must art у Рагачове. А самая любімая?.. Не ведаю, сёння — адна, заўтра — другая, бо я не люблю стаяць на месцы. Ёсць работа, якую я толькі мару зрабіць, але яшчэ не падступіўся, — ідэя звязана з маёй бабуляй, эскіз ужо даўно ёсць, але я ўсё чакаў, пакуль напрацую вопыт, удасканалю як след тэхніку.

**— Аляксандр, памер мае значэнне? Што прасцей маляваць: вялікі мурал на фасадзе шматпавярховага дома альбо, скажам, «абгортку» для трансфарматарнай будкі ці пад'езда?**


Мінск.

— Ведаеце, каб «хайпануць» — ох, не люблю гэта слова, — выклікаць ажыятаж, неабавязкова рабіць малюнак вялікіх памераў. Напрыклад, чым праславіўся Banksy (вулічны мастак, рэжысёр і палітычны актывіст з Англіі, твару якога ніхто не бачыў, а некаторыя вострасацыяльныя арт-работы ацэньваюцца ў мільёны долараў. — *Аўт.*)? Маленькімі работамі, якія маюць сатырычны пасыл... Таму мне цікава займацца самымі рознымі кірункамі, ад дызайну ўпакоўкі да ілюстрацый, ад паштовак да муралаў, і кожны новы вопыт чымсьці ўзбагачае, ён цікавы і карысны.

**— Пасля фэстаў вулічнай культуры Urban Myths і Vulica Brasil стрыт-арт, прынамсі ў Мінску, многія прынялі і ўпадабалі. А наколькі складана ўзгадняць, атрымліваць ад горада дазвол на кожную работу?**

— Калі ты маеш ідэю і можаш яе абгрунтаваць, растлумачыць, то не вельмі цяжка. Я заўжды за пошук кампрамісу архітэктуры і стрыт-арту, за тое, каб работа ўпісвалася ў кантэкст, была дарэчы. Мяжа паміж тым, чаго жадае мастак, да чаго ён імкнецца, і тым, чаго хочуць жыхары горада і людзі, якія ўзгадняюць прапанаваныя праекты, вельмі тонкая, і я разумею абодва пункты гледжання. Часам уласнае «я» перамагае, і мастак вырашае, што больш не будзе выконваць, скажам так, камерцыйныя работы для кагосьці, каб «не станавіцца маскультам». Аднак я не прытрымліваюся такіх перакананняў — і няхай лепш мяне выкрэсліваюць са спісаў беларускага стрыт-арту і запісваюць у афарміцелі, але я сам вырашаю, чым хачу займацца, не імкнуся за скандальным імем. Калісьці мяне вабіла графіці, быў цікавы ўвесь гэты адрэналін забароненасці, потым быў пэўны застой, потым — перыяд захаплення архітэктурай, дызайнам і г. д. Галоўнае — я знайшоў унутраную гармонію, і мае работы не маюць палітычнага падтэксту, не ўтрымліваюць нейкай «жэсці», якая шакіруе альбо раздражняе. Мне падабаецца, калі людзі ў розных гарадах, ад Валожына да Клічава, ад польскага Хэлмна да нашай Маларыты, выходзячы на вуліцу і гледзячы на мае работы, могуць проста ўсміхнуцца і ўзняць сабе настрой.

Гэтым летам я маляваў у Хэлмна, гэта правінцыйны гарадок недалёка ад Гданьска, а мая напарніца Маша Рудакоўская — у Мураўленка, гэта Ямала-Ненецкая аўтаномная акруга Расіі, і я, проста седзячы на рыштаваннях, дзеля цікавасці паглядзеў у «Гугле», што паміж намі каля 5 тысяч кіламетраў.

**— Адна з вашых візітовак — «птушыная» серыя.**

— Калі Карына Салавей з ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» прапанавала мне сумесны праект, міжволі давялося стаць арнітолагам, — смяецца мастак. — Мне здаецца, гэта вельмі крутая ідэя — увекавечыць у кожным раёне сваю птушку-сімвал: зімародкаў у Валожыне і Івянцы, вушатую саву і гогаля ў Мінску, сойку ў Клічаве, жаўрука-смецюха ў Маларыце... Важна, што сродкі на гэтыя праекты шторазы збіраюцца талакой, іх ахвяруюць самі людзі, якія хацелі б пабачыць такія муралы на фасадах, мясцовыя ўлады таксама ідуць насустрач, — і вялікі дзякуй усім, хто падтрымлівае гэтыя праект і дазваляе працягваць яго.



Стоўбцы.

Акрамя таго, сёлета мастакі творчага дуэта ТАКТАК паўдзельнічалі яшчэ ў некалькіх цікавых праектах: у Глушы з'явіўся прыпынак Алеся Адамовіча, а ў Стоўбцах — чатыры велізарныя паштоўкі-муралы на шматпавярховых дамах, звязаныя з рознымі порамі года, чатырма коласаўскімі мясцінамі (Акінчыцы, Ласток, Альбуць, Смольня) і радкамі паэта. Чым больш дэталёва прапрацоўваеш малюнак, тым больш часу патрэбна на яго выкананне. На кожны з муралаў у Стоўбцах спатрэбілася да 6-7 дзён, а на рэалізацыю ўсяго праекта — каля паўгода; трэба было як след інфармацыйна падрыхтавацца, каб зразумець ідэю, падабраць фарбы, сабраць у галаве «канструктар», як гэта будзе выглядаць.

Колькі часу «жыве» стрыт-арт? Графіці супрацоўнікі камунальных службаў могуць замаляваць і праз дзве гадзіны, а лёс муралаў залежыць перадусім ад якасці фарбаў — напрыклад, расійскія і кітайскія хутка выцвітаюць, іспанскія або нямецкія не страчваюць яркасці да 7—10 гадоў.

**— Стрыт-арт — больш пра ідэю, мастацкую самарэалізацыю, чым пра камерцыю?**

— Для мяне самога было дзіўна, але стрыт-арт можа быць цалкам прыбытковым заняткам. Але варта памятаць, колькі часу і сродкаў ідзе на стварэнне аднаго мурала: эскіз, узгадненні, нятанная фарба, матэрыялы і г. д. Канешне, ёсць сезоннасць, позняй восенню і зімой ніхто не будзе рабіць муралы, але цікавей выношваць новыя задумы і чакаць наступнага сезона, а ў перапынку займацца чымсьці іншым.

**— Неяк вы давалі майстар-класы для дзяцей у школах і дзіцячых дамах. Як уражанні?**

— Насамрэч з дзецьмі вельмі цікава працаваць, нават весялей, чым з некаторымі мастакамі. Помню, зрабіў контуры будучага малюнка, паказаў, як працаваць з насадкай на балон са спрэем, каб не зафарбаваць сябе і іншых, выдалі мы школьнікам пальчаткі, маскі і далі поўную свабоду дзеянняў. Звычайна за дзень у мяне атрымліваецца «зліць» ад 40 да 80 балонаў, потым проста «памірае» палец, якім націскаеш на кнопку, і сыходзіш ніякі. А дзеці з такім імпэтам узяліся за справу, што зрабілі тое самае за паўгадзіны. Маляваць, як дзеці — гэта яшчэ трэба ўмець і мець талент. Прынамсі, яны робяць гэта ад душы і іх розум яшчэ не забіты бытавымі праблемамі, страхам нешта сапсаваць.

**— Многія падлеткі імкнуцца паспрабаваць свае сілы ў стрыт-арце. Дасце некалькі парад пачаткоўцам: што трэба рабіць, а чаго, наадварот, не варта?**

— Галоўная парада — малюйце, калі не можаце не маляваць. Для мяне графіці — гэта была не мода, а любоў з першага позірку. Мы з сябрамі прыязджалі на Брэсцкі вакзал і перамалёўвалі ў свае сшыткі выявы на цягніках, якія прыходзілі з Польшчы, а ў школе на перапынках тонамі малявалі эскізы. Так што я ўпэўнены: калі чалавеку падабаецца стрыт-арт, то ён любымі шляхамі знойдзе для сябе інфармацыю і магчымасці, знойдзе фарбы — гэта раней іх было не дастаць, а цяпер — на любы густ. Так што — малюйце, малюйце, удасканальвайцеся і не спыняйцеся. І другая парада: для пачатку, каб набіць руку, можна паўтараць іншыя работы, але потым — не стварайце сабе куміраў, шукайце сваё. Лепш рабіць дрэнна, але па-свойму, і з цягам часу колькасць пяройдзе ў якасць. Наконт таго, чаго не варта рабіць... Я люблю графіці, мне падабалася пачуццё адрэналіну ад таго, што робіш нешта нелегальнае, а потым — напэўна, пасталеў і зразумеў, што за свае ўчынкі трэба адказваць. І таму параю пачаткоўцам: не рабіце чагосьці, калі не гатовыя несці за гэта адказнасць. Маю на ўвазе не толькі работу ў рамках закона, а наогул чалавечую адэкватнасць, уменне дамаўляцца з іншымі. Калі гэтаму навучыцца, да вас пачнуць прыцягвацца такія ж адэкватныя людзі, і жыццё стане нашмат больш простым і прыемным.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з архіва мастака і з адкрытых крыніц.**


Польскі Хэлмна.

**Дарэчы**

**Не блытайце стрыт-арт і графіці: другое — частка першага, але не наадварот. Як жартуюць некаторыя мастакі, розніца ў грашах: графіці — тое, за што ты заплаціш (штраф), стрыт-арт — тое, за што табе заплацяць.**




## УРОКІ ІНШАЙ МОВЫ

І хацеў бы забыць, але...

Жнівень 1942-га. Вайна. Эвакуацыя. Мы з мамай ні села ні пала апынуліся на Волзе, у зусім невялічкай вёсачцы. Школа там, праўда, ёсць, але толькі чатыры класы, а мне трэба ісці ў пяты, у суседняе мардоўскае сяло.

Туды адвяла мяне мама, прыстроіла на кватэру да старэнькай бабулі. Дамовіліся, што я, апроч вучобы ў школе, буду дапамагаць ёй па гаспадарцы, а яна мне — што-кольвек варыць у печы.

І вось мой першы дзень: усё, што сказала гаспадыня, я да вечара зрабіла, стамілася, прылягла на лаўку, дзе гаспадыня адвяла мне месца начаваць, і не заўважыла, як прыснула, а вось прачнулася ад нейкага зусім незнаёмага свербу...

Чую, бабуля таксама не спіць: звесіўшы ногі, сядзіць на печы і таксама чухаецца.

— Гэта — клапы, — кажа мне. — Зараз нап'юцца-нагуляюцца і сыдуць. Ты спі, не звяртай увагі.

Але ж які там сон?!

Усю ноч я прамучылася, увесь дзень думала, шукала выйсце і, як здалося, знайшла. У суседнім доме жылі бабуліны ўнукі, мае аднакласнікі. Значыць (ідэя!), калі звечара завітаць да іх і прасядзець дапазна, клапы могуць пайсці на спачынак.

Сказана — зроблена: сядзім мы з дзяўчатамі, размаўляем, але ж яны нене ды і залапочуць па-свойму, па-мардоўску. А я тады нічога не разумею.

— Навучыце мяне сваёй мове, — прашуся ў іх.

Дзяўчаты — з радасцю: кажуць мне, як па-іхняму будзе «крэсла», «стол», «хлеб»... Назаўтра — новыя словы і новыя «настаўнікі», а напаслязаўтра — у хаце ўжо цэлая кампанія, і кожнаму ў ёй хочацца як найхутчэй навучыць мяне новай мове.

Я рабіла поспехі, але ж і памылкі, здаралася, таксама: варта было вымавіць чарговае слова ці фразу, як вакол мяне чуўся смех... А то і рогат... Пытаюся (па-мардоўску), з чаго? Дзеці аж заходзяцца.

І тут я разумею, што ў мяне і сапраўды атрымліваецца нешта смешнае — для іх...

А ў выніку гэтая не тое вучоба, не тое гульня цягнулася досыць доўга, аж пакуль я не пачала — хай не размаўляць — дык хоць разумець усё, што вакол мяне гаварылі іншыя.

...У вывучэнні мардоўскай мовы быў яшчэ адзін бясспрэчны плюс: мяней дакучалі клапы, бо спаць я кладалася позна-позна, калі яны таксама ўжо спалі.

**Раіса Васільева,**
*г. Падольск, Маскоўская вобл.*

## ЧЫЙ БОБ ЛЕПШЫ?

Байцы ўспамінаюць мінулыя дні, настаўнікі — сваю школу, вучняў.

Тады мы з імі праходзілі фальклор, вусную народную творчасць. Дзецям даручалася распытаць сваіх ды чужых бабуль і дзядуль, бацькоў, запісаць і прынесці ў школу прыказкі, прымаўкі, загадкі, прыпеўкі.

Як і варта было чакаць, дзеці з даручэннем паспяхова справіліся: зачытвалі тое, што запісалі, асобныя — нават спявалі... У тым ліку і гэта:

*Дзед боб малаціў,*
*Баба падсявала,*
*Дзед бабу папрасіў,*
*Баба не давала.*

— А чаго ён папрасіў? — спытаў нехта з дзяцей.

Настаўніца разгубілася — не ведала, што і казаць.

— Дык жа бобу! — падказаў нехта з дзяцей.

— А яму што — свайго не хапала? Ён жа малаціў...

— Бабін, мусіць, смачнейшы?

...Што і казаць, многія стравы ў баб, у жанчын, і сапраўды атрымліваюцца лепш. Вось мужчыны і просяць.

**С. Я. Атрохава,**
*в. Селішча, Слуцкі раён.*

## ЛЮДЗЕЙ СЛУХАЙ, А СВОЙ РОЗУМ МАЙ

З Алесем Ставерам мы пазнаёміліся ў гады студэнцтва (я вучыўся ў БДУ, ён — у педінстытуце), а вось зблізіла нас так званая беларуская Швейцарыя, або Лагойшчына. Я працаваў там настаўнікам, ён — школьным інспектарам, а таму не дзіва, што, стаўшы вядомым паэтам-песеннікам, менавіта сюды любіў прыязджаць у творчыя камандзіроўкі, выступаць у працоўных калектывах, у школах.

Дык вось неяк раз...

— Ты ведаеш, браце, — казаў па тэлефоне Алесь, — наважыўся я пад'ехаць у Лагойск, назбіраць апенек... Ды не адзін, а з двума сябрамі. Так што сустракай ды рыхтуйся ў праважатыя.

Адмовіць Алесю я, вядома ж, не мог: завяршыў усе неадкладныя справы і праз гадзіну-другую ўжо сустракаў знаёмы «масквіч», з якога выйшлі паэт Алесь Пісьмянкоў і вядомы літаратар, удзельнік абароны Брэсцкай крэпасці Алесь Махнач.

З такой вось вельмі паважанай кампаніяй мы хутка прыйшлі ў невялікі лес паблізу гравійкі, што вяла да Гайны.

Апенек тут сапраўды было шмат, толькі збірай ды напаўняй кашы. Адзінае — сонца ўжо хілілася на захад, нам трэба было спяшацца.

— Усё, хлопцы, кідаем... Выходзім да «масквіча», — скамандаваў я і паказаў, куды, у які бок нам трэба ісці.

Алесь Махнач толькі ўсміхнуўся: маўляў, памыляюся, трэба не туды, а якраз... наадварот, і рушыў першым. А я — неяк разгубіўся, не адважыўся пярэчыць шаноўнаму госцю, падумаў, можа, ён і праўда ведае лепш.

У выніку старэйшы з трох Алесяў, прыкметна кульгаючы (як, дарэчы, і Ставер), павёў нас за сабой, аж пакуль не скончыўся лес, не паказаліся нейкія хаты і постаць жанчыны, што жала траву на ўзмежку.

Гэта было зусім непадалёк, таму я папрасіў спадарожнікаў трохі пачакаць, а сам падаўся да жнейкі, каб распытаць, дзе ёсць мы і дзе ж гравійка.

...На шчасце, і яна, і «масквіч» былі не за светам: мы неяк дапаўзлі (бо стаміўшыся, з поўнымі кашамі...) і рады былі як дзеці! Асабліва — Алесь Пісьмянкоў.

— Ведаеце, хлопцы, у маёй жонкі заўтра дзень нараджэння, — казаў потым ён. — Так што зараз прыеду, насмажу лагойскіх апенек... Глядзіш, і падарунак ёй будзе!

...Што казаць — нядрэнны, можа, нават памятны. Але ж каб мы, крый бог, заблудзілі, яна б гэты дзень помніла даўжэй.

**Віктар Несцяровіч,**
*г. Лагойск.*

## ШЧАСЦЕ, КАЛІ Ў ДОМЕ ГАСПАДАР?

У нашых добрых знаёмых — сужэнцаў Н. — бізнес сямейны і, можна сказаць, паспяховы, *долі* ў ім — роўныя, а вось *ролі* — не зусім. Гэта значыць, што за мужам — сустрэчы, перагаворы і дагаворы, рэстараны, рыбалкі, трэнажорныя залы, за жонкай — усё астатняе, гэта значыць непасрэднае кіраванне людзьмі, штодзённая карпатлівая праца.

А зрэшты, чаму б і не: яна ж не горш адукаваная і юрыдычна падкаваная, да таго ж — рашучая, патрабавальная... Не толькі да іншых: у яе самой, як здаецца, усё па найвышэйшым разрадзе — і на працы, і дома. А між тым наймічак яна ніколі не прызнавала і не прызнае: сама з усім чыста спраўляецца! Хоць часам і думае, што вось так, мусіць, нельга, што муж — калі што — без яе прападзе.

Ён, праўда, так ніколі не лічыў. І хацеў даказаць.

Што з таго атрымалася? Ды сюрпрыз... У чыстым выглядзе.

Пачалося ўсё з таго, што жонцы і сапраўды дзён на колькі прыйшлося з'ехаць.

Муж у яе адсутнасць стаў кіраваць фірмай, падтрымліваць парадак у доме. А перад вяртаннем жонкі вырашыў паказаць, што таксама не зломак і ўмее ўсё. Для гэтага ў пасудамыечную машыну ён закінуў посуд, у пральную — запіхнуў пасцельную бялізну, прыкінуў, што прыгатуе на вячэру... Падумаў нарэшце, што няблага было б і прыбрацца: усё прапыласосіць, але ж не панская гэта справа.

Каб не траціць на яе свой каштоўны час, муж патэлефанаваў у інтэрнэтўкраму, заказаў дастаўку робата-пыласоса.

Яго мігам, можна сказаць, прывезлі (бо не кожны ж дзень такія заказы); тут жа, на месцы, праверылі, настроілі праграму. Згодна з ёй робат папрацаваў, потым ціха «прыпаркаваўся» ў кутку пакоя, а назаўтра (гаспадар ужо на работу пайшоў) сам уключыўся (ведама, праграма!) і пачаў пыласосіць.

Сабака, які ў адсутнасць іншых дамачадцаў дома быў за галоўнага, мякка кажучы, гэтага не зразумеў — зайшоўся абураным брэхам!

Робат на яго нуль увагі: працуе сабе ды ўсё.

Тады цюцька забег наперад... (Пыласос не спыніўся.) Паспрабаваў укусіць. (Не даецца і цвёрды...) Хацеў адпіхнуць — паўзе, куды хоча...

Моцны, карацей, арэшак! Але ж і сабака зусім не слабы.

«Не сілай, дык спосабам», — падумаў, мусіць, ён і ўспомніў, што для яго патрэб у ванным пакоі ляжаць паперкі. Матнуўся туды — прынёс. Робат — праглынуў. Спачатку чыстыя — і адну, і другую...

Сёмую — са сваімі экскрэментамі — сабака таксама прыцягнуў. Робат не спалохаўся: старанна расцёр па падлозе «змесціва» і (ура!) такі ж «папярхнуўся» — заглух!

Сабака святкаваў!

А тым часам і гаспадары ўжо да дома пад'ехалі. Муж, адчыняючы дзверы, загадкава прамовіў:

— Дарагая, цябе чакае сюрпрыз...

І ён сапраўды быў: пасярод пакоя, можна сказаць, «налажыўшы рукі», ляжаў «забіты» робат, а над ім з пераможным брэхам узвышаўся сабака.

...Адным словам, сюрпрыз удаўся. І жонцы ён, вядома ж, запомніцца, бо адмываць падлогу давялося самой — доўга, са смехам і, дзякаваць богу, з разуменнем, што муж хацеў як лепей. Проста атрымалася як... атрымалася.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Аднойчы ў лістападзе...

### Навошта нам патрэбен ледзяны душ з неба

Аднойчы ў лістападзе давялося на сабе адчуць, што такое славутая восеньская дэпрэсія. Было гэта ўжо гадоў не помню колькі назад, карацей, у мінулым тысячагоддзі. Прычына была самая што ні ёсць дзявоча-банальная: той, хто абяцаў прыйсці, не прыйшоў. Здараліся такія неспадзяванкі і раней, але тут, як кажуць, накрыла. А яшчэ лістапад тады быў самы што ні ёсць паскудны — суцэльны надвячорак без адзінага сонечнага праменьчыка, амаль кожны дзень хляпаў мокры снег або халодны дождж. Я хадзіла па пустых вуліцах, падстаўляючы гэтаму халоднаму мокраму твар, і думала пра тое, як бы добра было нікуды не прыйсці. Але дома чакала пухнатая шэрая жывёлінка, яна цалкам ад мяне залежала. Таму з тых бязмэтных вячэрніх вандровак я заўсёды вярталася ў сваю здымную хрушчоўку, амаль усю застаўленую пасляваенНай цяжкой мэбляй, з цяжкімі бронзавымі статуэткамі герояў Грамадзянскай вайны, з вясёлкавымі ад старасці хрустальнымі келіхамі ў пукатым серванце. Кошка церлася аб ногі, спявала сваё курну, утульна ўладкоўвалася на каленях... І адкрылася тады дзівосная карункавая паэзія Цвятаевай і Янішчыц, глыбіня Дастаеўскага, шчырасць Караткевіча — кнігі сталі найлепшымі спадарожнікамі па вечарах, іх можна было прымаць замест снатворнага. Асабліва калі ў шыбу барабаніў кроплі і галіны старой бярозы і завываў пранізлівы перадзімовы вецер...

З таго часу я вельмі люблю лістапад. Чакаю яго насцярожана, як пэўна, і кожны чалавек у гэтых шыротах, з нейкай падсвядомай трывогай назіраючы, як імкліва змяншаецца дзень, як роспачна трапечуцца апошнія лісты на клёне, спрабуючы яшчэ хоць колькі пратрымацца, як находзяць з усходу ці з поўначы цяжкія шэрыя хмары. Але калі ён, лістапад, становіцца безумоўнай рэальнасцю, з задавальненнем ныраеш у яго з галавой, паглыбляешся ў яго цягучую самоту, сам становішся яго часткай. Успамінаеш, што на паліцы стаяць любімыя кнігі — не спампаваныя на смартфон, а сапраўдныя, жывыя, у якіх шалясцяць старонкі, загнутыя вуглакі, падкрэсленыя алоўкам радкі, якія зачапілі калісьці цябе ці кагосьці іншага, хто чытаў. Набіраеш нумар сяброўкі, якая за тысячы кіламетраў, — не пішаш у месенджары, як звычайна, у пераездах на розных лініях метро, а ўладкоўваешся на крэсле ці канапе, каб спакойна пагаварыць аб усім-усім, каб пачуць голас, каб сагрэцца цёплымі ўспамінамі.

Дастаеш з далёкага закутка ў шафе старыя фотаальбомы. Там чорна-белыя карткі далёкіх і блізкіх сваякоў, клапатліва падпісаныя на адвароце мамай (каб ведалі, хто). У іх заспакоеныя твары, яны з тых пажаўцелых здымкаў глядзяць прама табе ў вочы, нібы ведаюць нейкую найвялікшую таямніцу жыцця і хочуць з табою ёй падзяліцца. Кожны раз (раз на год — у сярэдзіне лістапада), гартаючы тыя альбомы, думаеш, што вось жа трэба раздрукаваць і пакласці туды новыя фота, што цісnуцца на экране смартфона бяздушнай каляровай мазаікай. (Лістапад мінае, ідзя забываецца, альбомы вяртаюцца на месца з тым жа напаўненнем...) Здзіўляешся і радуешся любові хатняга гадаванца, якая — зусім не так, як у нас, найвышэйшых істот, — не ставіць ніякіх умоў: цябе проста любяць такім, які ты ёсць, і табе ніколі не здрадзяць. Сам адчуваеш дзівосную пяшчоту да гэтага насамрэч вельмі нават шкадлівага стварэння — мяккага кавалачка цяпла ў халодным раўнадушным свеце.

Зноў і зноў, кожны вечар, набіраеш нумары родных людзей (а ў іншы час звоніш ім, бывае, раз на тыдзень), уяўляеш, як цёпла і ўтульна ў іхнім далёкім доме, як яны здымаюць трубку, як зручна ўладкоўваюцца з кубачкам гарбаты, каб пагаварыць з табой — пра навіны, якіх за тыя суткі, што не сазвоньваліся, не так шмат і набралася, пра «як на рабоце», пра дождж і пра тое, што абяцаюць замаразкі. Свяцлееш душой ад гэтых размоў і ведаеш, што ім таксама гэта патрэбна, што яны адчуваюць тое самае, што мы адно аднаму жыццёва неабходныя...

Лістапад са сваім холадам, цемрай і пранізлівым адчуваннем самоты вяртае нас да самых сябе. Лістапад — насамрэч дзівосны месяц, калі мы становімся сапраўднымі, калі пачынаем заўважаць і адчуваць нешта вельмі важнае, калі становімся больш шчырымі ў сваіх памкненнях, калі вельмі хочам цяпла і як ніколі гатовыя дзяліцца ім самі. Можа, так і задумалі Нябёсы — кожны год наладжваць нам гэткі ледзяны душ, каб ачомаліся ад суцэльнай вар'яцкай гонкі, спыніліся, агледзеліся, зразумелі, што насамрэч важна ў жыцці наогул і ва ўласным лёсе... Дзякуй ім, што даюць нам такую перадышку.

**17.40** Музычны фестываль Вярб'е. Рычард Гуд.
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** 90 гадоў Мікалаю Дабранрававу. «Лінія жыцця».
**21.45** Сусветныя скарбы.
**22.00** Канцэрт-прысвячэнне Дзмітрыю Хварастоўскаму ў тэатры «Новая опера».
**23.50** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**2.15** «Месяцовыя вандроўцы». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітkоўскім: «Кіначасопіс «Ералаш» — нашай маладосці». 2007 год (12+).
**6.40, 8.30, 9.45, 11.00, 14.00, 15.45, 20.05, 21.45, 0.55, 2.35, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30, 13.00, 1.30** Маст. фільм «Бронзавая птушка» (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Тацяннай Візбар. 2008 год (12+).
**17.00, 23.05** «Песня-80» (12+).
**18.00** Маст. фільм «Пункт вяртання» (16+).
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Памяці Хвасценкі». 2004 год (18+).
**5.10** «Канцэрт Тота Кутуньё». 1985 год (12+).

## EuroSport 1

**1.05, 16.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-17).
**2.05, 9.00, 13.00, 18.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**5.00** Watts.
**5.30** Фігурнае катанне. Гран-пры Расіі.
**7.30, 14.30, 23.00** Снукер. Northern Ireland Open. Фінал.
**10.30** Аўтагонкі. World Endurance Championships.
**11.00** Аўтагонкі. WTCR.
**11.30, 21.00** Дроны. DR1 Champions.
**12.30** «Дух парусната спорту».
**19.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**22.00** Алімпійскія гульні. «Зала славы».

## Кінакамедыя

**0.55** Выгляд зверху лепшы (12+).
**2.35** Фанаткі на сняданак не застаюцца (16+).
**4.35** Тры лані на алмазнай сцежцы. 1—4-я серыі (12+).
**8.20** Дзевяць ярдаў (18+).



**10.15** Скандынаўскі фарсаж (16+).
**12.05** Скандынаўскі фарсаж. Гонкі на лёдзе (16+).
**14.00** Прыкінься маім мужам (16+).
**16.00** }{отт@бь)ч (16+).
**17.50** Жывёла (12+).
**19.30** Superперцы (16+).
**21.40** Прыгожыя дзяўчаты (16+).
**23.50** Каханне і іншыя катастрофы (12+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.10** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.50** «Доктар І...» (16+).
**8.20, 19.00, 2.15** «Чыста маскоўскія забойствы». Серыял (12+).
**10.00, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.40, 17.15** «Варажбітка» (12+).
**12.50, 16.15, 5.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**13.50** «Адкрыта з Аксанай Байрак» (16+).
**14.45** «Простыя складанасці» (12+).
**15.20** «Натуральны адбор» (12+).
**20.55** «Нераскрыты талент». Серыял (16+).
**22.00** «Савецкія мафіі» (16+).
**22.50** «Дзікія грошы» (16+).
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.25** «Ідэнтыфікацыя Борна». Баявік (12+).



## ТБ1000

**6.10, 17.55** Прысяжная (16+).
**8.25** Секс у вялікім горадзе (16+).
**11.10** Цёмны рыцар (16+).
**14.00** Планета 51 (12+).
**15.50** Брыджыт Джонс: грані разумнага (16+).
**20.10** Пакуль не згуляў у скрыню (12+).
**22.05** Мой хлопец — псіх (16+).
**0.25** Джэкі (18+).
**2.20** Дзявяткі (16+).
**4.10** Дарый, хачу з табой ажаніцца (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Змешаныя пачуцці (16+).
**8.15** Чорная маланка (0+).
**10.25** Кіно пра Аляксеева (12+).
**12.20** Чэмпіёны (12+).
**14.20** СуперБабровы (12+).
**16.20, 4.30** Плямяшка. 1-2 серыі (12+).
**18.05** Шпіён (16+).
**20.20** Нябесны суд (16+).
**22.20** Настаўніца (12+).
**0.55** Мама не гаруй-2 (16+).
**3.00** Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).



## Discovery

**6.00** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**6.45** Гульні розуму (16+).
**8.00** Надзвычайны доктар Пол (16+).
**9.30, 2.20** Дзікі тунец (16+).
**10.15, 4.00** Сапраўдны суперкар (16+).
**11.05** Місія: Плутон (16+).
**11.50** Ледзяная дарога (16+).
**12.35** Шаша праз пекла (16+).
**13.20** Інстынкт выжывання (16+).
**14.05, 0.45** Марс (16+).
**14.55** Тэхаскі ўлоў (16+).
**15.40, 22.00, 1.35, 4.50** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**18.45, 0.00** Космас: прастора і час (16+).
**19.35** Невядомая планета Зямля (12+).
**21.10** Сапраўдны геній (16+).
**22.45** Секунды да катастрофы (16+).
**23.10** Гарачыя граніцы: Лацінская Амерыка (16+).
**3.10** Аўта-SOS (12+).
**5.35** Навуковыя недарэчнасці (16+).

## National Geographic

**8.00, 16.00, 22.00** Махінатары (12+).
**9.00, 17.00, 23.00, 4.40** Круты цюнінг (12+).
**10.00, 15.00, 21.00** Як гэта ўстроена? (12+).
**11.00, 20.00, 5.30** Склады (12+).
**12.00, 1.00, 6.20** Зброя паамерыканску (16+).
**13.00** Забытая інжынерыя (12+).
**14.00, 3.50** Небяспечная работа (16+).
**18.00, 0.00** Залатая ліхаманка (16+).
**19.00, 2.00, 7.10** Скрозь кратовую нару (12+).
**2.55** Разбуральнікі легенд (16+).

# ТРЭЦІ ВЯСКОВЕЦ — ПЕНСІЯНЕР



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

**галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Таццяна ФЁДАРАВА.**

Першы варыянт: калі чалавек мае права на пасяленне ў дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў (тут маюцца на ўвазе перш за ўсё медыцынскія паказанні), то, каб правесці восень і зіму ў камфортных умовах і пад медыцынскім наглядам, ён можа пасяліцца туды на часовае (да аднаго года) або кароткатэрміновае (да аднаго месяца) пражыванне.

Па пытаннях уладкавання ў дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў неабходна звяртацца ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Дадзеная паслуга даступная ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Другі варыянт: непрацаздольным грамадзянам, якія не могуць пражываць самастойна, на зіму можа быць арганізавана кароткатэрміновае знаходжанне ў аддзяленнях кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў у тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Сёння функцыянуюць 62 такія аддзяленні на 2103 месцы.

Трэці варыянт: мясцовыя органы ўлады апошнім часам укараняюць такую новую форму жыццеўладкавання непрацаздольных грамадзян, як дамы самастойнага (сезоннага) пражывання, у якіх пажылыя людзі жывуць працяглы тэрмін альбо толькі ў асенне-зімовы перыяд, самастойна арганізуюць сваё харчаванне, салідарна аплачваюць камунальныя паслугі.

Чацвёрты варыянт: пажылыя вяскоўцы могуць аб'ядноўвацца для сумеснага пражывання ў зімовы перыяд і ў адным з наяўных у іх дамоў. Такая форма жыццеўладкавання вясковых пенсіянераў атрымала назву дома зімоўкі. А тэрытарыяльнымі цэнтрамі пры неабходнасці арганізуецца сацыяльнае абслугоўванне пажылых людзей, якія пражываюць сумесна.

**На 1 кастрычніка гэтага года ў 39 дамах самастойнага (сумеснага) пражывання знаходзіліся 194 чалавекі, у трох дамах сезоннага пражывання і 283 дамах зімоўкі — 584 чалавекі.**

* * *

На слыху зараз і такая новая форма сацыяльнага абслугоўвання, як замяшчальныя сем'і. Яна была ўведзеная на заканадаўчым узроўні з 25 снежня мінулага года. Гэта, па словах **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандра РУМАКА,** аказанне сацпаслуг паўналетняму непрацаздольнаму грамадзяніну ва ўмовах сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі яго і таго чалавека, які аказвае сацпаслугі. Пры гэтым непрацаздольнаму грамадзяніну павінна быць забяспечана пражыванне ў асобным жылым пакоі.

Сацыяльныя паслугі ў замяшчальнай сям'і аказваюцца адзінокім непрацуючым інвалідам I або II групы і адзінокім непрацуючым грамадзянам, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту.

Памочнікам, які аказвае сацыяльныя паслугі, можа быць дзеяздольны грамадзянін ва ўзросце ад 18 да 65 гадоў, не інвалід I або II групы і не асоба, абавязаная па законе ўтрымліваць непрацаздольнага грамадзяніна.

Аляксандр Румак адзначае, што сацыяльнае абслугоўванне ў замяшчальнай сям'і ажыццяўляецца на падставе дагавора аказання сацыяльных паслуг. Рашэнне аб яго заключэнні прымаецца мясцовым выканкамам. Для заключэння дадзенага дагавора трэба звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр па месцы рэгістрацыі (месцы жыхарства).

Таксама ў апошнія гады сталі з'яўляцца і «прыёмныя сем'і» для людзей сталага веку — яны аб'ядноўваюць пад адным дахам сям'ю і пажылога чалавека, які мае патрэбу ў дапамозе. Трапляючы ў сям'ю, пажылы чалавек атрымлівае з боку «прыёмных дзяцей» увагу і клопат, сам аказвае ім пасільную дапамогу па доглядзе дзяцей і вядзенні гаспадаркі.

**Святлана БУСЬКО.**

# СЛОВАМ

## сацыяльнага работніка слухаць і гаварыць



**Таццяна РАДКЕВІЧ з Надзеяй Іосіфаўнай ГАЛАВІНОЙ.**

паскардзіцца на балячкі. Таму і бачыцца галоўным для сацыяльнага работніка ўменне слухаць.

Таццяна Мікалаеўна на гэтай рабоце з 2009 года. Раней працавала паштальёнам, таксама ўвесь час даводзілася камунікаваць з людзьмі. А ўменню паспачуваць другому чалавеку вучылася ўсё жыццё, якое яе не песціла. Яна адна гадуе дзвюх дачок. Муж памёр пяць гадоў таму. Цяпер старэйшая ўжо першакурсніца, малодшая вучыцца ў дзявятым класе. Дзяўчынкі растуць памочніцамі маці і не толькі ў сваёй уласнай гаспадарцы. Калі трэба, на канікулах і бабулькам падбягуць дапамагчы.

**Намеснік дырэктара Бярозаўскага тэрытарыяльнага цэнтра абслугоўвання насельніцтва Людміла МАРОЗ** кажа, што Таццяна Радкевіч належыць да тых работнікаў, пра якіх можна сказаць: чалавек на сваім месцы. Два гады таму Таццяна Мікалаеўна была ўзнагароджана падзячным лістом Бярозаўскага райвыканкама. Тады яна даглядала ляжачую хворую. Хадзіла да падапечнай па тры разы на дзень, а не тройчы ў тыдзень, як патрабуе службовая інструкцыя, і наогул аднеслася як да роднага чалавека.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Бярозаўскі раён.*

# Санаторый дома і гурткі для пажылых

— Для таго каб зразумець, якая дапамога патрабуецца канкрэтнаму пажылому чалавеку, мы пастаянна праводзім абследаванні дома, — расказвае **дырэктар Жыткавіцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ніна РАМАНОВІЧ.** — У прыватнасці, сёння ў Чырвоненскі сельскі Савет выехала шэсць чалавек.

Штотыдзень супрацоўнікі цэнтра з Жыткавічаў ажыццяўляюць два-тры выезды ў раён. І ўсё для таго, каб на месцы зразумець і разабрацца, каму якія патрабуюцца паслугі. Тут лічаць, што трэба зрабіць усё, каб пажылы чалавек як мага даўжэй змог жыць у сябе дома. Пры гэтым яму прапануюць сацыяльнае абслугоўванне, гаворыць Ніна Мікалаеўна:

— Звычайна пры абследаванні заходзім у дом, правяраем работу сацыяльнага работніка, ажыццяўляем кантроль сродкаў рэабілітацыі, глядзім, ці прыбрана ў доме, ці можа чалавек дровы сабе прынесці або прыгатаваць ежу, ці дапамагаюць сваякі яго абслугоўваць. Калі сваякоў няма — прапануем нашы паслугі. Бывае так, што спачатку людзі катэгарычна адмаўляюцца. Тады мы накіроўваем у гэты дом псіхолага. Дамаўляемся, што сацработнік папрацуе месяц-два. Гаворым: калі не задаволіць дапамога — адмовіцеся. Як правіла, потым сацыяльныя работнікі становяцца амаль што роднымі і надалей пажылыя людзі ўжо не ўяўляюць жыцця без іх дапамогі.

Ніна Мікалаеўна адзначае, што на пачатку года на абслугоўванні ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва было 930 чалавек, сёння іх — 950. І гэта з улікам таго, што кожны месяц 14-15 людзей сталага веку ў раёне пакідаюць гэты свет. Але ж колькасць тых, каго цэнтр абслугоўвае, становіцца большай.

Распытаць пажылога чалавека пра яго штодзённыя праблемы — абавязковая місія супрацоўнікаў цэнтра. Выслухоўваюць прэтэнзіі, праблемы, просьбы пра меддапамогу. Таму звычайна работа ідзе яшчэ і разам з медыкамі. Здараецца, што вясковую бабулю трэба тэрмінова шпіталізаваць, што і дапамагаюць зрабіць інспектары з раёна.

— Цяпер у нашым раёне чатыры дамы зімоўкі, — гаворыць Ніна Рамановіч. — На халодны перыяд звычайна разам збіраюцца блізкія сваякі: родныя ці стрыечныя сыходзяцца ў адзін дом, каб было весялей і зручней. На сённяшні дзень мы плануем і прыёмныя сем'і — унесена адпаведная прапанова ў бюджэт наступнага года. А яшчэ ў нас практыкуецца так званы санаторый дома. У населеным пункце дамаўляемся з нейкай гаспадыняй. У яе



**Загадчык аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Любоў МАКУШЭНКА і адзінокая 86-гадовая Зося ЧАБАТАРОВА з Жыткавічаў.**

дома збіраюцца пажылыя людзі, бавяць час не толькі за гарбатай. Да іх прыходзяць супрацоўнікі сельсавета, Дома культуры, ФАПа, сацыяльныя работнікі. На працягу месяца праводзім медагляд, у тым ліку прызначаюцца пэўныя курсы лячэння.

І гэта далёка не ўсе мерапрыемствы, якія практыкуюцца ў раёне для людзей сталага веку. Восенню і ранняй вясной ужо традыцыйна праходзіць акцыя «Чысты дом і чысты двор». Спецыялісты цэнтра дапамагаюць зрабіць генеральную прыборку ў тых дамах і дварах, дзе гэта асабліва неабходна.

Усім, хто на абслугоўванні, супрацоўнікі цэнтра прапануюць «зялёную аптэку»: загадзя нарыхтаваныя травы бясплатна разносяць інвалідам і адзінокім пенсіянерам.

— Цяпер вось вырашылі, што да дня інваліда ў нас будзе дабрачынны канцэрт, — адзначае Ніна Мікалаеўна. — Кожны купіў па тры білеты: адзін для сябе, а два — для інвалідаў і адзінокіх. Ім мы білеты бясплатна раздаём і прывозім у Жыткавічы на канцэрт.

Да таго ж 44 пажылыя жыхары Жыткавічаў пастаянна займаюцца ў спартыўнай зале, яшчэ каля 90 — непастаянна. Для гэтага ёсць тут два трэнажоры, але Ніна Мікалаеўна спадзяецца, што з'явяцца і яшчэ некалькі. Папулярнай у раёне стала скандынаўская хада. Цяпер пенсіянеры з глыбінкі шпацыруюць са спецыяльнымі палкамі па наваколлі. Таксама ж актыўна ходзяць у гурткі: займаюцца рукадзеллем, асвойваюць камп'ютар і нават з задавальненнем танцуюць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# АДЗІНОКІМ ВЫДЗЯЛЯЕЦЦА... КВАТЭРА

## Перажыць зімовыя халады жыхары Гродзенскага раёна могуць у доме з усімі выгодамі

**Роўна год таму для адзінокіх пенсіянераў выдзелілі кватэру ў горадзе Скідзелі. У двух пакоях могуць пражываць чатыры чалавекі. Летась такой магчымасцю скарысталіся тры жанчыны. У найбліжэйшы час у дом сумеснага пражывання пераедуць дзве пенсіянеркі з Гродзенскага раёна.**



### БРЫКЕТ НЕ ВЫПІСВАЛА

Святлану Віктараўну з невялічкай вёскі Ракіце ўдалося застаць яшчэ дома, якраз напярэдадні пераезду. Яна ўжо сабрала неабходныя, на яе думку, рэчы. Багаж аказаўся не такі і малы — заняў добрую частку пакоя. Тут і пасцельная бялізна, і посуд, і адзенне...

Святлана Віктараўна аказалася ветлівай жанчынай. Сустрэўшы на парозе, адразу зрабіла экскурсію па доме. Больш за ўсё ўразіла печ, бо цягнулася, нібы сцяна, ад аднаго да другога пакоя. Паліць у гэтай печы — справа нялёгкая, асабліва для чалавека, якому за 80. Святлана Віктараўна паказвае на мяшок дроў, які яна прынесла зранку.

— Звычайна дровы прыносіць мая памочніца Галіна, яна ў нас сацыяльны работнік, — расказвае жанчына, — я таксама пацізу нашу. Запас... З мінулага года. Сёлета не выпісвала ні дроў, ні брыкету, думаю, што абыдуся без паліва. У новай кватэры і так цёпла.

### УСЁ, ШТО ТРЭБА ДЛЯ КАМФОРТУ

Аценіць усе выгоды гарадскога жыцця жыхарка вёскі змагла яшчэ летась. Тады яна ў ліку некалькіх навасёлаў трапіла ў дом самастойнага сумеснага пражывання ў Скідзелі. Па сутнасці, гэта асобная кватэра ў жылым доме плошчай 53 «квадраты». У мінулым годзе яе перадалі на баланс раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Як паведаміла **загадчыца аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Валянціна КАСКЕВІЧ,** за бюджэтныя сродкі зрабілі рамонт пакояў, газавага абсталявання, электраправодкі, устанавілі пажарныя апавяшчальнікі, купілі ўсю неабходную мэблю і бытавыя прыборы, у тым ліку халадзільнік і тэлевізар.

— Для сумеснага пражывання можна выкарыстоўваць любое памяшканне, нават чыйсьці дом, — кажа Валянціна Каскевіч. — Але мы пайшлі на тое, каб для гэтых мэт прапанаваць добраўпарадкаваную кватэру, дзе ёсць цэнтральнае ацяпленне, з крана цячэ гарачая вада, недалёка знаходзіцца гандлёвы цэнтр. За жыхарамі такой кватэры абавязкова замацаваны сацыяльны работнік.

— Там вельмі добра, кватэра вялікая, вокны вялікія, светла, цёпла, усё на месцы, хочаш — купайся хоць кожны дзень, а тут толькі па-даўнейшаму — у балеі. А ў яе трэба яшчэ і вады нанасіць. Добра, што сацыяльны работнік дапамагае.

### КАБ ПАЗБЕГНУЦЬ ДЭПРЭСІІ

Дом, у якім зараз пражывае Святлана Віктараўна, ёй выдзеліла мясцовая сельская гаспадарка, дзе зараз працуе сын. За невялікі кошт жыллё дазволілі выкупіць, кажа жанчына. Яна збіраецца зрабіць гэта вясной. Думае і пра рамонт, бо дом даволі стары, у некаторых месцах прасела столь. Жыве ў ім пенсіянерка каля 30 гадоў.

Святлана Віктараўна паказвае свой фотаздымак тае пары і яшчэ сямейнае фота з мужам адразу пасля вяселля. Абое маладыя, прыгожыя, яна — руская, ён — грузін, ваенны. Паехала за ім ажно на Далёкі Усход. Але сумеснае жыццё не склалася, і яна вярнулася назад. Што здарылася з ім далей — так і не ведае, як і пра лёс стрыечных братоў і сёстраў. Затое знаходзіць падтрымку ў сваіх аднавяскоўцаў, мясцовых улад, сацыяльных службаў. Яшчэ і сама калі-нікалі выязджае па прадукты ў суседнюю вёску. Але часцей карыстаецца аўтакрамай, якая заходзіць сюды тры разы на тыдзень. Вёска, хоць і малая, але не апусцела, амаль усе дамы дагледжаны.

Жанчына таксама раней трымала гаспадарку, але зараз ужо не здужае. Каб заняць сябе, шмат чытае, глядзіць тэлевізар, з ёй цікава пагаварыць. Нечакана агучыла і праблему пажылых людзей, якую не вельмі ахвотна прызнаюць пенсіянеры, асабліва вясковыя жыхары.

— Мяне ўвосень мучыць дэпрэсія, няма жадання кагосьці бачыць, чуць, апетыт прападае і жаданне нешта рабіць, рухацца, — прызнаецца жанчына. — А як паехала на зімовую кватэру, адразу другі настрой, быццам іншы чалавек. Таму ізноў хачу туды паехаць. Мы ніядрэнна ладзілі з маёй суседкай Марыяй Іванаўнай, разам ежу гатавалі, многа размаўлялі, ёй ужо амаль 90. У нашым узросце ёсць што ўспомніць...

На добрыя адносіны спадзяецца жанчына і зараз. Кожная гаспадыня прыязджае са сваімі кухоннымі прыладамі, а прадукты можна набыць у найбліжэйшым супермаркеце. Па словах пенсіянеркі, там вельмі ветлівыя прадаўцы і суседзі вакол добрыя, гатовыя дапамагчы.

### ЖЫЛЛЁ ЯК АЛЬТЭРНАТЫВА

Згодна са статусам дома сумеснага пражывання на засяленне могуць разлічваць адзінокія жыхары раёна, а таксама тыя, хто аказаўся ў цяжкім жыццёвым становішчы. «Кватаранты» атрымліваюць пенсію, самі ходзяць у краму, гатуюць ежу, самі плануюць свой дзённы распарадак. У гаспадарчых справах ім дапамагае сацыяльны работнік, які замацаваны за кватэрай. Дарэчы, яго абавязак — наведвацца кожны дзень, а калі ёсць патрэба — дапамагчы прыгатаваць страву, суправадзіць у краму альбо паліклініку, дапамагчы прыбрацца ці зрабіць гігіенічныя працэдуры. Плата за пражыванне і сацыяльныя паслугі ў месяц складае 60 рублёў. Дарэчы, у кватэры могуць жыць не толькі зімой, але і круглы год.

— Пакуль паслуга не вельмі вядомая, мы інфармуем нашых адзінокіх пенсіянераў, калі робім абходы, — кажа Валянціна Каскевіч. — У асноўным пажылыя людзі аддаюць перавагу паслугам сацыяльных работнікаў на даму. Гэта даступна ад 1 рубля 10 капеек да 1 рубля 60 капеек за візіт. Але не ва ўсіх вёсках мы можам знайсці людзей працаздольнага ўзросту, якія маглі б даглядаць састарэлых.

Такія кватэры — добрая альтэрнатыва для адзінокіх пенсіянераў з маленькіх вёсак. Засяліцца могуць і мужчыны, якія падалі свае заяўкі і сталі на чаргу. Тады гэта будзе чыста мужчынскі калектыў. Але яны, па словах Валянціны Каскевіч, аддаюць перавагу сацыяльным ложкам, дзе ім забяспечваецца поўнае абслугоўванне. Пакуль інтарэс да кватэр сумеснага пражывання праяўляюць жанчыны, якія з надыходам цяпла імкнуцца вярнуцца дамоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | ОАО «Плещеницлес», Минская обл., Логойский р-н., г. п. Плещеницы, ул. Октябрьская, 47 | | | |
| **Предмет аукциона** **Месторасположение:** Минская обл., Березинский р-н, **г. Березино**, ул. Соколовского, д.1 | | | | |
| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес (№ дома) |
| **Лот № 1** | | | | |
| **Контора** | Здание административно-хозяйственное | 255,6 кв. м | 611/С-31566 | д. 1 |
| Составные части и принадлежности: две пристройки, подвал | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,1673 га**, предоставлен Продавцу на праве аренды до 20.11.2063 г. для обслуживания здания конторы (для размещения объектов администрат. назначения). Ограничения (обременения): расположен в водоохранных зонах рек и водоемов (р. Березина) и в охранных зонах электрич. сетей напряжением до 1000 В, пл. 0,0028 га | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 24 711,33 бел. руб.** (снижена 50 %) | | | | |
| **Лот № 2** | | | | |
| **Бытовые помещения** | Здание специализир. коммунал. хозяйства | 114 кв. м | 611/С-31568 | д. 1, корп. 12 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,1092 га, предоставлен Продавцу на праве аренды до 20.11.2063 г. для обслуживания бытовых помещений (для размещения объектов обрабатывающей промышленности). Ограничения (обременения): водоохранные зоны рек и водоемов (р. Березина) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 5 320,62 бел. руб.** (снижена 50 %) | | | | |
| **Лот № 3** | | | | |
| **Столярный цех** | Здание специализир. для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | 143,7 кв. м | 611/С-31561 | д. 1, корп. 5 |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,1741 га, предоставлен Продавцу для обслуживания здания столярного цеха (для размещения объектов обрабат. промышленности). Ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны рек и водоемов (р. Березина), и охранные зоны электрич. сетей напр. до 1000 В, пл. 0,0232 га и свыше 1000 В, пл. 0,0229 га | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 7 685,34 бел. руб.** (снижена 50 %) | | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 16.10.2018** | | | | |
| **Аукцион состоится 17.12.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 12.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42**. www.cpo.b**y. Email: auction@cpo.by | | | | |



**ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении открытого аукциона по продаже объектов ОАО «Белорусский цементный завод»**

**Лот № 1.** Здание цеха деревообработки с инвентарным № 732/С-5301, площадью 498,7 кв. м, ограждение дощатое с инвентарным № 732/С-11107, бетонное, асфальтовое покрытие, бетонная дорожка с инвентарным № 732/С-11109, площадью 388 кв. м, находящихся по адресу: Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Набережная, 32. Начальная цена продажи **77083,13 рубля** с НДС. Задаток для участия в аукционе составляет 10 %, или 7708,31 рубля.

Аукцион состоится **17.12.2018 в 14.00** по адресу: Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Юношеская, 117. Заявление на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 14.12.2018 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – 17.12.2018 с 12.00 до 13.45 по месту проведения аукциона.

Продавец: ОАО «Белорусский цементный завод», 213640, г. Костюковичи, ул. Юношеская, 117, тел. 8 (02245) 58-019. Организатор аукциона: ООО «БелИнвестОценка», 220108, г. Минск, ул. Казинца, 62, пом. 910.

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь, Указом Президента Республики Беларусь от 5 мая 2009 г. № 232 (с изменениями и дополнениями) и Порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов. Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

*Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBB2. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с Открытым акционерным обществом «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи с 9.00 до 17.00. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-29-44, 8 (029) 615-40-08, e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by



**ОБЪЯВЛЕНИЕ о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов**

| | |
|---|---|
| 1. Дата, время, место проведения аукциона: 17 декабря 2018 года, в 14.00, в здании Великодолецкого сельского дома культуры, ул. Лесная, 2 а | |
| 2. Адрес участка | Участок № 1: д. Заозерье, ул. Озерная, 6А, Великодолецкого сельсовета Ушачского района, Витебской области, возле озера Муроги |
| 3. Площадь участка | 0,1523 га |
| 4. Кадастровый номер | 224980706101000063 |
| 5. Начальная цена | 3500,00 рубля |
| 6. Шаг аукциона | 350,00 рубля |
| 7. Размер задатка | 350,00 рубля |
| 8. Место, дата, время, начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 16, в рабочие дни с 9.00 до 16.00 с 16.11.2018 по 11.12.2018 включительно | |
| 9. Размер задатка вносится на расчетный счет: Великодолецкий сельский исполнительный комитет BY93AKBB36413280114852300000 в ф-ле № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, код AKBBBY21216, УНП 300007086, ОКПО 28677750 | |
| 10. Адрес и номер контактного телефона: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 16, Великодолецкий сельисполком, тел.: (8 02158) 53323, 53338, в рабочие дни с 8.00 до 16.00 | |

# ГОДНАЯ СТАРАСЦЬ ДОМА І НЕ ТОЛЬКІ

**Вопыт сацыяльнага абслугоўвання пенсіянераў Віцебскай вобласці цікавіць расіян**



У Воранаўскім доме-інтэрнаце для састарэлых і людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

## Кожны чацвёрты — пенсіянер

У Прыдзвінскім краі ў пажылым узросце каля 25,3 % — прыблізна 298,6 тысячы — чалавек. У многіх сацыяльных «ноу-хау» вобласць была першапраходцам. Потым яны пераймалася ў іншых абласцях і ў прыгранічны. Каб рэалізоўваць новыя формы работы з састарэлым насельніцтвам, вывучаўся перадавы еўрапейскі вопыт, выкарыстоўваліся свае напрацоўкі.

Цяпер у пенсіянераў, якія маюць патрэбу ў дзяржаўным клопаце, ёсць багаты выбар: ад санаторыя дома да адмысловых «дзіцячых садкоў» на дзень. А калі ўжо ёсць намер жыць у дзяржаўнай установе, умовы самыя годныя.

Дарэчы, стан спраў у іх вывучалі на месцы не так даўно дэпутаты абласнога Савета, пабываўшы ў Воранаўскім доме-інтэрнаце для састарэлых і людзей з абмежаванымі магчымасцямі Віцебскага раёна. Тут адначасова могуць жыць каля 140 чалавек. У пакоях — па адным, два чалавекі.

## У «садок» на дзянёк

Новая паслуга ў гэтай установе — магчымасць знаходзіцца ў інтэрнаце не ўвесь час, а колькі захочацца: ад аднаго дня і больш. Жартам персанал і самі бабулі-дзядулі называюць гэта «дзіцячым садком для састарэлых».

У ахвотных, такім чынам, ёсць выдатная магчымасць пажыць у цяплыні і клопаце, калі цяжка паліць у печы ў халодны час года. Некаторыя проста хочуць цікава правесці час, каб было з кім пагутарыць, заняцца рукадзеллем. Ва ўстанове больш за дзесяць гурткоў: вышывання, праваслаўны, за здаровы лад жыцця. Ёсць і падсобная гаспадарка, у якой вырошчваюць агародніну. І многія пенсіянеры з задавальненнем працуюць там. Як і ў майстэрнях, напрыклад па вырабе сувеніраў з ільну, штучных кветак.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** канстатаваў, што «ў вобласці ў такіх інтэрнатах самыя годныя ўмовы. Праблем з размяшчэннем няма. Канешне, ніхто не заклікае, як той казаў, «здаваць» сюды старых. Але ж, калі чалавек у паважным узросце жыве адзін, здароўе дрэннае, дык чаму б не дажыць свой век у годных умовах?»

«Гасцям», а менавіта так паважліва называюць тут пенсіянераў, прапануюць таксама рэабілітацыйныя праграмы, водныя працэдуры.

Дарэчы, у вобласці функцыянуе 15 стацыянарных установаў сацыяльнага абслугоўвання, у якіх пражывае звыш 3,5 тысячы чалавек.

## І дома паклапоцяцца

Летась у Прыдзвінскім краі паспяхова выпрабавалі паслугу — дзённы комплексны догляд людзей у паважным узросце, якія яшчэ не маюць права на гарантаваныя дзяржавай сацпаслугі. «Першапраходцамі» сталі Аршанскі, Лёзненскі і Пастаўскі раёны.

Як удакладнілі ва ўпраўленні сацыяльнай падтрымкі насельніцтва і стацыянарных установаў камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама, вельмі неабходны такі клопат людзям, якія, напрыклад, пасля выпіскі з бальніцы знаходзяцца дома пасля інсульту. Або ўзнікае шмат праблем у тых, хто перанёс аперацыю пасля пералому шыйкі сцягна — вельмі небяспечная сітуацыя. Такія фактычна не могуць выйсці з дома. Многім неабходна дапамога, каб памыцца ці перадзецца. Паслугі платныя, але даступныя па цане для людзей нават з параўнальна невялікімі даходамі.

Усё больш запатрабаваная такая паслуга, як хатні санаторый: пасля агляду медыкаў праводзіцца рэкамендаваны курс рэлаксацыі, рэабілітацыі. Старыя могуць дома папраўляць настрой пры дапамозе святлотэрапіі, падчас праслухвання прыемнай музыкі, навучыцца правільнаму дыханню, якое аднаўляе сілы...

Вучацца і самастойна займацца скандынаўскай хадой. А ў Сенненскім раёне актыўна ў свой час узяліся за навучанне пенсіянераў катанню на веласіпедзе. «Колы», дарэчы, можна ўзяць бясплатна.

## Супрацоўнічаюць і вучаць

Пяты год Віцебшчына супрацоўнічае з маскоўскім геранталагічным навукова-даследчым медыцынскім цэнтрам. Мэта — зрабіць старэнне часам, калі чалавек максімальна эфектыўна жыве.

У Маскве ў адным з інстытутаў павышэння кваліфікацыі сацыяльныя работнікі з Віцебшчыны сталі слухачамі курса па асновах медыцынскіх ведаў па доглядзе састарэлых. Гэта вельмі важна, бо трэба ведаць і медыцынскія нюансы.

У сваю чаргу, вялікую цікавасць да беларускага вопыту праяўляюць у прыгранічных рэгіёнах Расіі. У прыватнасці, пра гэта расказала **першы намеснік губернатара Пскоўшчыны Вера ЕМЯЛЬЯНАВА**. Падчас сустрэчы ў аблвыканкаме абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва ў сферах сацыяльнай абароны, аховы здароўя, занятасці. Расіяне агучылі, што плануюць укараніць у сябе беларускія стандарты — наконт функцыянавання інтэрнатаў, надомнага абслугоўвання пенсіянераў ды іншыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# РОДНЫЯ НЕ ПА КРЫВІ, А ПА ДУШЫ

**Здараецца, і даволі часта, што пад адным дахам не могуць ужыцца нават родныя, сваякі: дзеці з бацькамі, бабулі, дзядулі — з унукамі. А бывае, што чужыя людзі становяцца блізкімі не па крыві, а па душы.**

У сям'і Занкавіч з аграгарадка Любань Вілейскага раёна пражывае інвалід другой групы Таццяна Душкіна. Дзяўчынка нарадзілася з сіндромам Даўна. Яе даглядала маці. Але жанчына адышла ў іншы свет, а сястра цяжка захварэла і не змагла ўзяць клопат аб нямоглай Таццяне на сябе. Вядома, сам-насам з горам сацыяльныя службы не пакінулі б інваліда, уладкавалі б у інтэрнат. Аднак лёс распарадзіўся інакш, выпадкова звёўшы 53-гадовую жанчыну з Вольгай Занкавіч. Вольга Мікалаеўна з мужам выгадавалі трох дачок, дачакаліся ўнукаў. Здавалася б, жыві ды радуйся. Аднак Вольга Мікалаеўна — сацыяльны работнік — адна з тых, хто спачувае гору іншага, чужы боль успрымае як уласны. Таму і вырашыла ўзяць у сям'ю Таццяну. Муж Аляксандр Уладзіміравіч падтрымаў жонку.

Для новага члена сям'і ў кватэры выдзелілі асобны пакой. Жанчына не можа ні прыгатаваць ежу, ні прыбрацца, ні купіць прадукты. Усё гэта робіць за яе гаспадыня. Больш за тое, вучыць яе пісаць, чытаць, маляваць, вязаць кручком дываны з падручных матэрыялаў. Асабліва задаволеная Таццяна, калі Вольга Мікалаеўна ў вольны час садзіцца разам з ёй гуляць у шашкі.

У Нарачанскім сельсавеце Ганна Кісель са сваім мужам прытуліў 59-гадовага Анатоля Міцкевіча, у якога няма ні сваякоў, ні блізкіх, якія б маглі паклапаціцца аб інвалідзе другой групы.

У пасёлку Партызанскім Рэгіна Зіновіч пусціла ў свой дом адзінокую пенсіянерку 1932 года нараджэння Ганну Захараву, з якой сябравалі яе бацькі. А калі тыя памерлі, то стала для яе як родная маці. Сацыяльныя работнікі адзначаюць, што жанчыны вельмі сябруюць, у іх хаце заўсёды чыста, акуратна, утульна. Яны радуюцца гасцям і вельмі цёпла адклікаюцца адна аб адной. Таму да іх заўсёды прыемна наведвацца.

— Гэтыя тры сям'і, якія раней былі прыёмнымі, пагадзіліся перайсці ў статус замяшчальных. Паміж раённым тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання, прынятым і памочнікам заключаны трохбаковыя дагаворы. Памочнік гэта — фізічнае асоба, якая аказвае паслугі ў форме сацыяльнага абслугоўвання ў замяшчальнай сям'і, — тлумачыць **загадчыца аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Вілейскага ТЦСАН Данута РАМАНОЎСКАЯ**. — У дакуменце дакладна вызначаны адрас пражывання, адказнасць, абавязкі і правы ўсіх зацікаўленых бакоў, а таксама паслугі, якія павінна аказваць сям'я, парадак скасавання дагавора. Дадаткова прынятыя пагадненні, якія прадугледжваюць крыніцы фарміравання агульнага бюджэту замяшчальнай сям'і, і артыкулы яго расходавання. Папярэдне гэтыя ўмовы ўзгадняюцца з усімі ўдзельнікамі працэсу. Бюджэт складаецца як са сродкаў прынятага ў сям'ю, так і памочніка.

Памочнік за сваю работу не атрымлівае зарплату, паколькі не лічыцца ў штаце цэнтра. Таму, зразумела, яму цяжка ўзваліць на сябе дадатковыя расходы па ўтрыманні новага члена сям'і. А састарэлым людзям і інвалідам, якія часта хварэюць, неабходныя лекі, часам дарагія, прадукты харчавання, адзенне, абутак, мыйныя сродкі. Акрамя таго, яны карыстаюцца паслугамі сувязі, камунальна-бытавымі. Памочнікі, вядома ж, не патрабуюць справаздачы за кожны рубель. Усё выбудоўваецца на ўзаемным даверы.

У Вілейскім раёне ў 2016—2017 гадах было восем прыёмных сем'яў. У двух з іх старыя адышлі ў іншы свет. У статус замяшчальных перайшлі тры. Астатнія пакуль думаюць.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паводле новай рэдакцыі закона «Аб сацыяльным абслугоўванні» працэдура афармлення стала больш складанай, працяглай, а рамкі больш жорсткімі. Пры райвыканкаме створана спецыяльная камісія, якая прымае адпаведнае рашэнне, абавязкова заключаецца трохбаковы дагавор. Усё гэта патрабуе дадатковага часу. У нарматыўнай базе дакладна агавораны крытэрыі, якім павінна адпавядаць замяшчальная сям'я. Прыняць сюды цяпер можна толькі непрацаздольнага адзінокага чалавека, які дасягнуў 75 гадоў, або інвалідаў першай і другой групы, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі. Прычым грамадзянін, які бярэ іх да сябе, павінен быць дзеяздольным ва ўзросце ад 18 да 65 гадоў. Акрамя таго, патрабуецца адпаведнае рашэнне райвыканкама аб пераходзе ў новы статус.

З аднаго боку, гэтыя навацыі няздрэнныя, уносяць дакладнасць і канкрэтнасць у працэс. З другога, стала вузейшым поле дзейнасці. У Вілейскім раёне, напрыклад, ёсць прыёмныя сем'і, дзе памочнікі дасягнулі 67—68 гадоў. Па гэтай прычыне такія сем'і не могуць стаць замяшчальнымі. Работнікі ТЦСАН выязджаюць у сельсаветы, на месцы вядуць работу з сем'ямі, якія маглі б узяць да сябе састарэлых, інвалідаў, тлумачаць ім, як гэта найлепш зрабіць. Пакуль такіх альтруістаў мала. Але хто мэтанакіравана працуе, той і дамагаецца вынікаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ПРАЦА ЁСЦЬ, БЫЛО Б ЖАДАННЕ

## Работу для вяскоўцаў прапануюць нават у абласным цэнтры

**У вёсцы Ждановічы прайшоў сельскі сход. На сустрэчу з жыхарамі прыехалі старшыня раённага Савета дэпутатаў Лідзія Дубікоўская, старшыня Чэрнеўскага сельвыканкама Аляксандр Кавалёў, прадстаўнікі цэнтра сацыяльнага абслугоўвання, жыллёва-камунальнай, медыцынскай службаў, раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях.**

Вяскоўцы адразу ж падзякавалі старшыні раённага Савета дэпутатаў за дапамогу ў рамонце дарогі, якая вядзе да іх населенага пункта. Галоўнай жа тэмай сустрэчы стала абмеркаванне Дэкрэта № 1 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва», піша Дрыбінская раённая газета «Савецкая вёска».

Лідзія Дубікоўская расказала жыхарам аб дзейнасці раённай камісіі па працаўладкаванні. Яна акцэнтавала ўвагу на тым, што трэба індывідуальна падыходзіць да сітуацый, калі грамадзяне не працуюць, але хочуць і могуць зарабляць сабе на жыццё легальным спосабам. У раёне створаны ўсе ўмовы для працаўладкавання. Штомесяц праводзяцца кірмашы вакансій (у раёне на дадзены момант іх 147). Старшыня райсавета растлумачыла, як прайсці перанавучанне тым, хто хоча атрымаць новую спецыяльнасць, напрыклад прадаўца, кухара, цырульніка і нават кіроўцы тралейбуса, калі ёсць жаданне працаваць у Магілёве, то даецца магчымасць прайсці перападрыхтоўку, заключыць дагавор і працаваць.


www.dribin.by

Таксама старшыня райсавета растлумачыла, дзе і як можна аформіць рамесную дзейнасць і займацца аказаннем паслуг насельніцтву. Лідзія Савельеўна прывяла прыклады тых, хто ўжо пачаў працаваць як рамеснік або адкрыў сваю справу пры садзейнічанні ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Акрамя таго, яна пацікавілася працай аўтамагазіна, паштовай службы, распытала, што хвалюе жыхароў. А яшчэ звярнулася з просьбай да вяскоўцаў, каб яны падтрымлівалі належны санітарны стан каля сваіх падворкаў, на вуліцах і дарогах.

Жыхары вёскі мелі магчымасць задаць свае пытанні і атрымаць кампетэнтныя адказы.

# У ГЛУШЫ АДЗНАЧЫЛІ ДЗЕНЬ ПАСЁЛКА

**Свята пачалося з ускладання кветак да мемарыяльнага комплексу ў гонар памяці загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны жыхароў пасёлка.**

Як паведамляе раённая газета «Трыбуна працы», у Доме культуры адбылося святочнае мерапрыемства. Так, у фае арганізавалі рэтра-выстаўку «Зроблена ў СССР», дзе была прадстаўлена атрыбутыка мінулых гадоў: патэфоны, кнігі, вымпелы, дакументы і іншыя рарытэты. Акрамя гэтага, тут размясціліся экспазіцыі дзіцячых малюнкаў на тэму «Я люблю цябе, Глуша», майстроў народнай творчасці, рамеснікаў. А ў актавай зале прайшоў канцэрт, падрыхтаваны Глушанскім, Тугаліцкім дамамі культуры і раённай дзіцячай школы мастацтваў.



www.tribunapracy.by

У межах мерапрыемства старшыня сельвыканкама Марыя Сушчанка ўзнагародзіла мясцовых грамадскіх актывістаў ганаровымі граматамі і сувенірамі. Падзячнымі лістамі і падарункамі таксама былі адзначаны гаспадары найлепшых падворкаў — Тамара Некраш, сужэнцы Ірына і Андрэй Сіняўскія. Словы падзякі прагучалі і ў адрас шматдзетнай сям'і Рак.

ДЗЕНЬ САВЕТА

# Увага актыўным і ініцыятыўным

**Арганізацыя работы з моладдзю па месцы жыхарства стала тэмай Дня Мхініцкага сельскага Савета, што на Магілёўшчыне.**


www.redflag.by

Удзельнікі пабывалі ў Казельскай сельскай бібліятэцы, дзе даведаліся, як развіваюць цікавасць да кніг у вясковай моладзі, а таксама ацанілі тэатралізаванае прадстаўленне да юбілеяў кніг «Юбілейная тусоўка» з удзелам вучняў мясцовай школы, піша «Чырвоны сцяг. Краснаполле».

На думку **старшыні раённага Савета дэпутатаў Анжалікі ГОМАН**, няглядзячы на работу, што праводзіцца ў Казельскай бібліятэцы, неабходна выкарыстоўваць вопыт іншых устаноў, якія маюць пэўныя напрацоўкі і дасягненні. Напрыклад, сельскай бібліятэкі аграгарадка Леніна, у якой працуе энтузіяст сваёй справы Галіна Каваленка. Жанчына на працягу амаль 30 гадоў па крупінках збірала і сістэматызавала матэрыялы пра гісторыю вёсак і людзей, якія жывуць у іх. Па выніках абласнога агляду конкурсу «Мой родны кут — вытока ўсіх вытокаў» яна стала пераможцам. Гэтыя і многія іншыя напрацоўкі, як і падыходы ў рабоце, могуць стаць годным прыкладам для многіх бібліятэк не толькі Краснапольскага, але і іншых раёнаў Магілёўшчыны.

Аб дзейнасці ДУА «Казельскі ВПК дзіцячы сад — сярэдняя школа» па патрыятычным і працоўным выхаванні моладзі ва ўзаемадзеянні з маладзёжнымі грамадскімі арганізацыямі ішла гаворка пры наведванні гэтай установы адукацыі. Дарэчы, у мікрараёне школы, уключаючы аддаленыя вёскі Выдранка, Аўчынец, Сабалі, Горкі пражываюць 42 юнакі і дзяўчаты ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

Адным з кірункаў па працы з моладдзю ва ўстанове з'яўляецца маральна-патрыятычнае выхаванне, якое ажыццяўляецца праз далучэнне юнага пакалення да гісторыка-культурных і этнаграфічных каштоўнасцяў. Вялікую дапамогу ў гэтым аказвае школьны краязнаўчы музей. Знаёмства з установай працягнулася ў спартыўнай зале, дзе прайшла таварыская сустрэча па валейболе паміж камандамі школьнікаў і мясцовай моладзі. Яе ініцыяваў настаўнік фізічнай культуры і здароўя Вадзім Еўдакімаў. Пасля заканчэння навучальнай установы ён вярнуўся на малую радзіму, абзавёўся сям'ёй. Вадзім Сяргеевіч, як чалавек захоплены сваёй справай, арганізаваў спартыўны клуб, які з задавальненнем наведвае вясковая моладзь. З яго з'яўленнем спартыўна-масавая і фізкультурна-аздараўленчая работа ў мікрараёне школы актывізавалася.

> «Актыўнасць у вольны час з'яўляецца найважнейшым аспектам для моладзі. Маладыя людзі такім чынам атрымліваюць магчымасць самарэалізацыі. Таму важна ведаць не толькі сучасныя культурныя патрэбы моладзі і арыентавацца на іх, але і ўмець хутка рэагаваць, прапаноўваць новыя віды і формы працы.

Цікавымі бачацца метады, якія выкарыстоўваюцца ў рабоце Халмянскага вясковага дома культуры па далучэнні моладзі да фальклорнай спадчыны: удзельнікам прадэманстравалі абрад «Жаніцьба коміна», што бытуе ў гэтай мясцовасці са старадаўніх часоў. Тут жа, у мясцовым ачагу культуры, падвялі вынікі працы. Старшыня раённага Савета дэпутатаў Анжаліка Гоман адзначыла, што менавіта актыўнасць у вольны час з'яўляецца найважнейшым аспектам для моладзі. Маладыя людзі такім чынам атрымліваюць магчымасць самарэалізацыі.



Таму важна ведаць не толькі сучасныя культурныя патрэбы моладзі і арыентавацца на іх, але і ўмець хутка рэагаваць, прапаноўваць новыя віды і формы працы. На чале любога віду такой дзейнасці перш за ўсё павінен стаяць чалавек актыўны і ініцыятыўны, які ўмее весці за сабой іншых і даваць прыклад, вартыя пераймання. Па выніках Дня Савета старшынёй раённага Савета дэпутатаў Анжалікай Гоман дадзены даручэнні кіраўнікам аддзелаў, устаноў і арганізацый раёна.

**Матэрыялы падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 15 лістапада 2018 года.**